Навіны Беларускага Народнага Фронту «Адраджэньне»

Выдаецца са сьнежня 1988. — 1—25 сакавіка 1993 г. — № 3(38) — Кошт 5 рублёў

Дзень Волі

Семдзесят пяць гадоў таму наш народ заявіў пра сваё права займаць пачэсны пасад між народамі й дзяржавамі сьвету. Абраны Першым Усебеларускім кангрэсам Выканаўчы камітэт абвясьціў 9 сакавіка 1918 году пра ўтварэньне Беларускае Народнае Рэспублікі. 25 сакавіка 1918 году Беларуская Народная Рэспубліка была абвешчана незалежнаю.

Змаганьне пакаленьняў беларусаў дало плён. Над Менскам лунае наш адвечны бел-чырвона-белы штандар, а дзяржаўным гербам краіны зноў стала Пагоня. Да нас спакваля вяртаецца родная мова.

Але радасьць азмрочвае трывога. Сілы мінуўшчыны перайшлі ў наступ. Камуністычныя ўлады давялі эканоміку да руіны, рынкавых рэформаў няма, дзяржаўную маёмасьць раскрадае намэнклятура. Заключаюцца пагадненьні, якія замацоўваюць залежнасьць нашае краіны ад усходняга суседа. Пачалася прапагандысцкая кампанія за дзяржаўнасьць на Беларусі расейскае

Да 75-годзьдзя абвешчаньня Беларускае Народнае Рэспублікі

мовы. Улады зганьбілі сябе забаронаю патрабаванага амаль паўмільёнам выбаршчыкаў рэфэрэндуму. Урэшце, незаконна аднаўленая КПСС – партыя, якая нясе адказ за пакуты нашага народу, якая збройна нішчыла БНР і тых людзей, якія прагнулі волі. Дзень незалежнасьці не зацьверджаны як дзяржаўнае сьвята Рэспублікі Беларусі. На шляху да спаўненьня ідэалаў 25 Сакавіка яшчэ давядзецца пераадольваць ці мала перашкодаў, а найперш – зацяты супраціў камуністычных ды антынезалежніцкіх сілаў, што пануюць на Беларусі. Але перамога дэмакратыі непазьбежная, як прыход вясны.

Дзень Волі набліжаецца!

Прымеце ж, дарагія суайчыньнікі, нашыя шчырыя сьвяточныя зычаньні посьпехаў у Вашых добрых справах і спаўненьня запаветных мараў.

Заклікаем вас успомніць вясну 1918 году – вясну нашага народу – ды ўрачыста, прылюдна ці толькі ў сваёй сям'і, сярод сяброў сказаць добрае слова пра тых ахвярных людзей, якія не пашкадавалі жыцьця дзеля Бацькаўшчыны, яе народу.

Клічам вас прыйсьці 21 сакавіка аб 11 гадзіне на плац Незалежнасьці і разам зь сябрамі Беларускага Народнага Фронту, Беларускага Згуртаваньня Вайскоўцаў, дэмакратычных партыяў узяць удзел ва ўрачыстым шэсьці і мітынгу каля помніка Янку Купалу.

Жыве Беларусь!

Зварот Сойму БНФ "Адраджэньне"

Дарагія грамадзяне Беларусі, суродзічы!

75 гадоў таму, 25 сакавіка 1918 году, змаганьне пакаленьняў беларусаў за адраджэньне нашае дзяржаўнасьці прывяло да перамогі. Рада Беларускае Народнае Рэспублікі ў сваёй III Устаўной Грамаце абвясьціла сьвету пра незалежнасьць Беларусі, пра яе вызваленьне з акупацыйных путаў, пра волю беларусаў да будаваньня ўласнага дэмакратычнага, міралюбнага, заможнага гаспадарства.

Гісторыя незалежнае БНР была нядоўгаю й трагічнаю. Свабоду Беларусі растапталі акупанты з усходу й захаду, але ніхто ўжо ня мог задушыць памкненьня беларусаў да незалежнасьці. Бальшавікі ў процівагу БНР змушаныя былі пайсьці на абвешчаньне БССР – калёніі савецкай імпэрыі пад выглядам нацыянальнае дзяржавы, дзе беларускі народ нішчылі фізычна й духоўна. Але існаваньне БССР, насуперак жаданьню бальшавікоў, нагадвала пра дзяржаўную традыцыю беларусаў. Гістарычная справядлівасьць і дзяржаўная пераемнасьць пачала аднаўляцца ў жніўні 1991 г., калі была зноў дакляраваная незалежнасьць нашае Бацькаўшчыны.

75-гадовы шлях ад III Устаўной Граматы Рады БНР да прызнанае большасьцяй краінаў сьвету Рэспублікі Беларусі – шлях ахвярнага змаганьня й пакуты, але ж і шлях прасьвятленьня, шлях вяртаньня соцень тысяч і мільёнаў суайчыньнікаў да нацыянальнае сьведамасьці, шлях адраджэньня дэмакратычнага сьветагляду й традыцыяў на Беларусі.

Беларусы даволі ўжо нацярпеліся, гібеючы ў марнай працы на чужыя імпэрыі ды на падманлівую камуністычную ідэю. Чарговы раз падмануць наш народ ня ўдасца нікому. Дарма спадзяюцца сілы мінуўшчыны на рэванш: звароту назад ня будзе. Будучая Беларусь – незалежная й дэмакратычная, шанаваная ўсімі народамі сьвету, культурная й працавітая эўрапейская краіна.

Толькі адбудова ўласнае незалежнае дзяржавы яднае народ, дазваляе яму перажыць нават самыя цяжкія часы, ведаючы, што цярпеньні ня пойдуць намарна, бо адбудова ўласнага дому дзеля сябе, дзеля дзяцей і ўнукаў – гэта сьвятая і радасная праца. Праца, якую асьвятляе ідэал 25 Сакавіка. Хай жа водбліск гэтага дня натхняе нас і надалей!

Жыве Беларусь!

13 сакавіка 1993 г.
г. Менск

ЗМАГАРАМ ЗА БНР

Ня вер бальшавікам ніколі,
Ад іх не дачакацца Долі.
У іх для нас заўсёды – краты,
Яны з нас робяць вінаватых,
Бо мы на роднае зямлі
Душы сваёй не прадалі.
Ні маскалям, ні хітрым ляхам,
І не глядзім на іх са страхам.
Ня вер бальшавікам нідзе!
А хто паверыць – прападзе
Адразу, нібы мыш рудая.
Што кажа бальшавік, ён – знае...
Яму ня трэба нашых Сьвят,
Ён, бальшавік – амаль вар'ят,
І ён цябе не пашкадуе,
І ён сваіх не пашкадуе,
Ён не душу – ён зло ратуе.
Яму ня трэба БНР,
І ён задушыць, нібы зьвер,
Усіх, хто хоча вольнай Волі.
Ня вер бальшавікам ніколі!

Пагоня над зямлёй ляціць,
І сам Пан Бог на нас глядзіць.

Віктар Шніп

Малюнак Аляксея Марачкіна

Ня хлебам адзіным...

Паведамленьне Рэспубліканскай творчай суполкі "Пагоня" прафэсійных беларускіх мастакоў і мастацтвазнаўцаў

Вось ужо трэці год дзейнічае творчая суполка "Пагоня", у якую ўваходзяць сябры Саюзу мастакоў Беларусі – жывапісцы, графікі, скульптары, майстры дэкаратыўна-ўжытковага і народнага мастацтва, мастацтвазнаўцы. Вытокі гэтага згуртаваньня ідуць ад сярэдзіны 70-х гадоў. Менавіта тады, у глухія для нашай культуры часы, група мастакоў, якая складае сёньня асноўную частку суполкі, пачала далучаць беларускага гледача да родных каранёў, да гісторыі Бацькаўшчыны, ладзячы гістарычна-мэмарыяльныя мастацкія выставы, прысьвечаныя выдатным дзеячам гісторыі і культуры Беларусі. На палотнах і аркушах, габэленах і ў скульптуры ўзьнікалі славутыя постаці Рагнеды і Еўфрасіньні, Міколы Гусоўскага і Цёткі, Францішка Скарыны і Кастуся Каліноўскага. Тыя выставы, спадзяемся, спрыялі абуджэньню самасьвядомасьці беларусаў, адказвалі на пытаньне, хто мы і адкуль, куды ідзем.

Ня так проста было спавядаць беларушчыну ў тыя часы. Былі і выклікі ў КДБ ды аддзелы ЦК КПБ, і разборкі на партсходах Саюзу мастакоў, і публічнае шальмаваньне.

Сёньня сябры суполкі, як і раней, працуюць дзеля адраджэньня Бацькаўшчыны. Калі ў 1991 годзе ў Вярхоўным Савеце Беларусі ставілася пытаньне пра беларускую дзяржаўную сымболіку, сябры суполкі арганізавалі ў сьценах Дома Ураду гістарычна-дакументальную выставу, прысьвечаную нацыянальным гістарычным сымбалям – бел-чырвона-беламу сьцягу і гербу "Пагоня". Яны ж распрацавалі эталён гербу Рэспублікі Беларусі, зацьверджаны Вярхоўным Саветам.

Суполка "Пагоня" наладзіла шэраг мастацкіх выставаў – у Менскім Палацы мастацтва, у Беларускім музэі ў Гайнаўцы на Беласточчыне, у 1992 годзе адкрывала сваёю выставаю Тыдзень беларускай культуры ў Вільні, рэгулярна робіць тэматычныя мастацкія экспазыцыі ў Доме літаратара. Цяпер сябры суполкі рыхтуюць мастацка-публіцыстычную выставу "Адраджэньне – 93", якая адбудзецца ў Палацы мастацтва 24 сакавіка і будзе прысьвечаная слаўнай даце – 75-ым угодкам з дня абвешчаньня незалежнасьці Беларускае Народнае Рэспублікі. Плянуецца і надалей шэраг выставаў і культурна-асьветных мерапрыемстваў, мэта якіх – пашыраць сярод гледачоў ідэалы Незалежнасьці Бацькаўшчыны, яе Адраджэньня.

Уся праца суполкі рабілася без аніякай фінансавай падтрымкі з боку дзяржаўных структураў і Саюза мастакоў, на сьціплыя складкі сяброў суполкі. Зважаючы на цяжкія матэрыяльныя ўмовы, якія перажывае нашая культура, і немагчымасьць у сувязі з гэтым зьдзяйсьняць творчыя і культурна-грамадскія праекты суполкі, мы зьвяртаемся да кіраўнікоў арганізацый і прадпрыемстваў, фірмаў, прыватных асобаў з просьбай матэрыяльна дапамагчы Рэспубліканскай творчай суполцы "Пагоня" ў ажыцьцяўленьні яе дзейнасьці, і ў першую чаргу – у арганізацыі выставы "Адраджэньне – 93", прысьвечанай 75-ым угодкам БНР.

Будзем шчыра ўдзячныя тым, хто нас падтрымае.

Разьліковы рахунак Рэспубліканскай мастацкай суполкі "Пагоня" 609097 у Цэнтральным аддзяленьні Прамбудбанку г.Менску, код 362.

Тэлефоны для даведак: 24-02-95, 26-05-59.

Рада Рэспубліканскай творчай суполкі "Пагоня"
прафэсійных беларускіх мастакоў і мастацтвазнаўцаў

Калякін і Рубанава супраць беларускіх дзяцей

12 сакавіка бацькі дзяцей садка № 376 "Заранка" з падтрымкаю Цнянскае Рады БНФ Савецкага раёну Менска пікетавалі будынак Савецкага РАНА на пр. Скарыны. Садок пачаў працаваць па-беларуску дзесяць гадоў таму, яшчэ пры камунізьме, насуперак процідзеяньню ўладаў. Мае жывое беларускамоўнае асяродзьдзе, дэмакратычную традыцыю, вабячы сьведамых бацькоў з усяго горада. Бацькі перакананыя, што пракамуністычныя раённыя ўлады (старшыня выканкаму – член бюро ПКБ Калякін) і даўно вядомая ўдзельнікам руху за беларускую школу загадчыца РАНА Рубанава (яшчэ ў 80-я гады не дапусьціла ўтварэньня беларускіх клясаў у СШ № 6 на падставе бацькоўскіх заяваў) скарысталі для разбурэньня нацыянальнага асяродку неабходнасьць рамонту. Адпаведная камісія гарсавету абумовіла пачатак рамонту абавязковым разьмеркаваньнем дзяцей у суседнія садкі па групах і разам з выхавальніцамі. РАНА праігнаравала гэтае рашэньне. Дзяцей раскідаюць у расейскія садкі ("чем ваши дети лучше других?"), выхавальніцы – без гарантаванага працаўладкаваньня. Барацьба працягваецца, з кожным днём набываючы палітычны падтэкст.

Да ўвагі кіраўнікоў і ўладальнікаў прадпрыемстваў, фірмаў ды арганізацыяў Рэспублікі Беларусі

25 сакавіка сёлета спаўняецца 75 гадоў з дня абвешчаньня Беларускае Народнае Рэспублікі. Гістарычнае значэньне тае падзеі немагчыма перабольшыць: нават тады, у ваенны час, шэраг дзяржаваў прызналі БНР. Тагачаснае абвешчаньне самастойнай Рэспублікі, ідэі і дакумэнты, якія суправаджалі гэтую падзею, выключна важныя і для сёньняшняе нашае дзяржаўнасьці; яны знайшлі адлюстраваньне ў праекце новай Канстытуцыі Беларусі.

Для шырокага сьвяткаваньня гадавіны гэтае падзеі нядаўна дэмакратычнымі грамадзкімі арганізацыямі і рухамі Рэспублікі быў створаны арганізацыйны камітэт, які запляноўваў шэраг сьвяточных мерапрыемстваў як масавага, так і навукова-культуралягічнага характару. Аргкамітэт запрашае Вас і ў Вашай асобе Ваша прадпрыемства ці арганізацыю прыняць актыўны ўдзел у сьвяткаваньні 75-годзьдзя БНР. Ваша фінансавая падтрымка праграмы сьвяткаваньня будзе ўкладам у патрыятычную акцыю дэмакратычных сілаў Беларусі.

Сродкі трэба пералічваць на разьліковы рахунак Гарадзкой Рады ТБМ № 700733, код 763, у Ленінскім аддзяленьні Белбізнэсбанку г.Менску з прыпіскаю "На сьвяткаваньне 75-й гадавіны БНР". Кантактныя тэлефоны: 360909, 325446.

Аргкамітэт

ПРАГРАМА
сьвяткаваньня 75-й гадавіны абвешчаньня Беларускае Народнае Рэспублікі

9 – 25 сакавіка 1993г.		Ушанаваньне памяці дзеячоў БНР і змагароў за незалежнасьць Беларусі.
19 сакавіка	17.00	Дом літаратара. Навуковая Акадэмія.
21 сакавіка	11.00	Менск. Пляц Незалежнасьці – праспэкт Ф. Скарыны – гай Янкі Купалы. Марш БЗВ "За незалежнасьць і дэмакратыю". Маніфэстацыя і ўрачыстае шэсьце дэмакратычных сілаў.*
	12.00–14.00	Гай Янкі Купалы. Мітынг, культурная праграма.
24 сакавіка	17.00	Менск. Палац мастацтва. Адкрыцьцё выставы "Адраджэньне–93" творчай суполкі "Пагоня" Саюзу мастакоў Беларусі.
25 сакавіка		Беларусь, замежжа. Урачыстыя набажэнствы ў сьвятынях усіх хрысьціянскіх канфэсіяў.
	14.00	Адкрыцьцё мэмарыяльнай дошкі на доме №9 па вул. Валадарскага (Братоў Луцкевічаў) у гонар абвешчаньня незалежнасьці БНР.
	17.00	Адкрыцьцё выставы ў Нацыянальным музэі гісторыі і культуры Беларусі
	19.00	Менск., Канцэртная заля Беларускае дзяржаўнае філярмоніі. Урачысты сход і сьвяточны канцэрт.
27 сакавіка		Вільня. Адкрыцьцё намагільнага помніка братам Луцкевічам на могілках Роса.

*Удзельнікі маніфэстацыі – прадстаўнікі палітычных партыяў, рухаў, грамадзкіх і культурных арганізацыяў, а таксама дэлегацыі зь іншых гарадоў і мястэчак – ідуць пад уласнай і мясцовай сымболікай (сьцяг, эмблема руху ці партыі, герб горада).
Збор удзельнікаў маніфэстацыі на пл. Незалежнасьці а 10.30.

БЕЛАРУСКІЯ ПАТРЫЁТЫ!

Беларуская Эвангельская Царква – гэта Ваша царква. Калі Вы за духоўнае Адраджэньне Беларусі, калі Вас непакоіць лёс роднай мовы, прыходзьце да нас штоаўторка а 18.30: Менск, вул. Гікалы, 4, Абласная бібліятэка ыя Пушкіна (за ЦУМам, дзе раней зьбіралася "Талака"), другі паверх, маладзежная заля, – і Вы знойдзеце аднадумцаў.

Тэлефануйце 70-89-87.
Пішыце: 220117, Менск,
вул. Любімава, д.21, кв.56.

СТАРШЫНІ КАЛГАСАЎ – ЗА АДСТАЎКУ ЎРАДУ

Раніцою 6 сакавіка фронтаўскі рафік жвава памчаў на паўднёвы захад, у бок Берасьця. Прадстаўнічая дэлегацыя БНФ кіравалася на традыцыйныя сустрэчы – у Пружаны, Малярыту і Кобрынь.

Першая сустрэча ў Пружанах пачалася апоўдні і доўжылася больш за чатыры гадзіны. Вялікая заля, запоўненая дарэшты, уважліва выслухала грунтоўнае спавешчаньне З.Пазьняка пра становішча на Беларусі, паведамленьні народных дэпутатаў Л.Баршчэўскага і Г.Сямдзянавай, інфармацыю Старшыні свабодных прафсаюзаў Беларусі Г.Быкава і намесьніка старшыні БНФ Ю.Хадыкі. Потым былі адказы на шматлікія пытаньні і гутаркі пасьля заканчэньня сустрэчы.

Наступнае спатканьне адбылося ў в.Равяцічы з групаю калагасных старшыняў зь Бярозаўскага раёну, якіх сабраў народны дэпутат Шымчук – сам старшыня мясцовага калгасу. Афіцыйна такая сустрэча адбылася ўпершыню. Таму яе вынікі асабліва цікавыя. На супрацьстаўленьне Народнага Фронту і гаспадарнікаў у вёсцы асабліва разьлічвалі камуністы. Але абодва бакі зь вялікай прыемнасьцю канстатавалі, што рэальных падставаў для канфрантацыі няма. Мы пабачылі энэргічных дасьведчаных людзей, якіх з камунізмам лучыць тое, што шмат гадоў яны былі папіхачамі ў сакратароў райкамаў.

Яны бачаць эканамічны развал і разумеюць неабходнасьць рэформаў, мэтаю якіх было б вяртаньне гаспадара на зямлю. І разам з тым у іхных калгасах людзі сёньня за захаваньне калектыўных гаспадарак, бо калгас – гэта ня толькі вытворчая адзінка, але і сацыяльны інстытут. Толькі пасьля стварэньня сыстэмы сацыяльнай абароны і падтрымкі старых і хворых мэтазгодна распускаць калгасы. Ужо сёньня кожны зь іх валодае той ці іншай тэхнікай. Эканамічна апраўданыя дастаткова буйныя гаспадаркі, і як зрабіць, каб яны апынуліся ў руках людзей здольных і працавітых – найважнейшае пытаньне. Пры гэтым эфэктыўнасьць вытворчасьці павялічыцца ня менш чым у два разы.

Сёньня ж старшыняў турбуе, што ўлада блізкая да страты кантролю над сытуацыяй. На палі ня вывезены торф і ўгнаеньні – няма паліва. Не паступае і тэхніка. Падаюць надоі, вытворчасьць мяса. Пры такім становішчы праз год-два ўпадуць ураджаі і вёска ня здолее карміць горад. Сустрэча скончылася тым, што "чырвоныя памешчыкі" запатрабавалі ад апазыцыі БНФ змагацца за адстаўку існуючага кабінэту. Таго, што З.Пазьняк і вызначыў як галоўнае палітычнае пытаньне ў пачатку гутаркі.

Першая сустрэча 7 сакавіка адбылася ў Малярыце. Тут упершыню пасьля праваλу жнівеньскага путчу 1991 г. на сустрэчу з народнымі дэпутатамі апазыцыі зьявіліся арганізаваныя вэтэраны КПБ–КПСС, якія прайшлі напярэдадні інструктаж у райвыканкаме. Але за мінулыя паўтара года яны, здаецца, нічому не навучыліся – тыя ж самыя "правакацыйныя" пытаньні, тыя ж спробы сарваць сход хуліганскімі выхадкамі. Але сустрэча, як і звычайна, цягнулася каля 4-х гадзінаў, бо, не адчуваючы ніякай падтрымкі, камуністычныя "актывісты" мусілі сьцішыцца.

Падобная атака тых, хто выйшаў з акопаў, паўтарылася і ў Кобрыне. Але тут яна была падтрыманая і трыма актывістамі "Славянского собора". Аднак заля, дзе адбывалася сустрэча, разьлічана на 500 чалавек, а мноства людзей яшчэ стаяла ў праходах і вэстыбюлі. Таму правакатары хутка сьцішыліся, адчуўшы настрой людзей. Прынесьлі толькі стос запісак з абразамі ды камуністычнымі дэклярацыямі.

Адсутнасьць падтрымкі выхадак актывістаў – вэтэранаў кампартыі прымушае задаць пытаньне: для чаго яны выйшлі з акопаў у апошні бой? Каб памерці "в борьбе за это"?

Юры Хадыка

На [illegible]арусь прыяжджала швайцарская аматарская суполка мастацкай самадзейнасьці. Адзін зь яе сяброў – сп. Андрэас Мюлер, радыёжурналіст, ахвяраваў "Навінам БНФ "Адраджэньне" 15 даляраў.

Шчыра дзякуем!

Рэдакцыя

Выказваем шчырую падзяку сп. Міхасю Белямуку (ЗША) за ахвяраваныя 50 амэрыканскіх даляраў. Грошы выкарыстаныя на рамонт штаб-кватэры БНФ.

Сакратарыят Управы БНФ

Паведамленьне пра сакавіцкі Сойм БНФ

13 сакавіка адбылося чарговае паседжаньне Сойму БНФ. З паведамленьнем пра стаўленьне да зьезду беларусаў сьвету, які хоча правесьці згуртаваньне "Бацькаўшчына", выступіў сябра Сойму, сябра Выканкаму БСДГ Анатоль Гурыновіч. Ён адзначыў, што невядомыя мэта і парадак дня зьезду, ніводная з палітычных арганізацыяў дэмакратычнага кірунку не атрымала афіцыйнага запрашэньня ўдзельнічаць у працы аргкамітэту. Фактычна гэты зьезд – спроба ўбіць клін паміж дэмакратычнымі арганізацыямі беларусаў у сьвеце. Аднак, разумеючы, што сустрэча беларусаў сьвету павінна адбыцца, Выканкам Грамады прапануе правесьці III Ўсебеларускую палітычную канфэрэнцыю. Пасьля вострай і працяглай дыскусіі Сойм прыняў рашэньне падтрымаць ініцыятыву Грамады і вылучыць прадстаўнікоў у аргкамітэт канфэрэнцыі.

З спавешчаньнем аб прынцыпах і дэвізах адраджэнскага народнага руху выступіў Старшыня БНФ Зянон Пазьняк. Нагадаўшы гісторыю ўзьнікненьня БНФ, як і іншых народных франтоў у рэспубліках былога СССР, ён адзначыў, што мы і зараз ня можам адмаўляцца ад формы шырокага народнага руху, бо па-ранейшаму існуе таталітарная сістэма ўлады. БНФ можна разглядаць як сумяшчэньне ідэялёгіі народнае партыі з арганізацыйнымі структурамі шырокага народнага руху. Асноўныя прынцыпы, якія мы павінны адлюстраваць у сваёй шырокай праграме – свабода, незалежнасьць, адраджэньне, справядлівасьць, салідарнасьць. Аналізую чы ўзаемасувязь гэтых прынцыпаў, З.Пазьняк спыніўся на пытаньні суадносінаў правоў чалавека і сувэрэнітэту. Мы не павінны паўтарыць памылкі, зробленыя да нас, і аддаць прыярытэт якому-небудзь з гэтых прынцыпаў. Варта прызнаць парытэт правоў чалавека і народу. (Тэкст выступу З.Пазьняка – у наступным нумары "Навінаў").

Сойм зацьвердзіў парадак вылучэньня дэлегатаў на зьезд: 1 дэлегат ад 10 сяброў і прыхільнікаў БНФ, членаў партыяў і груповак – калектыўных сябраў БНФ; 1 дэлегат ад 5 – удзельнікаў камісіяў Сойму; па 3 дэлегаты ад Менскай гарадзкой і абласных радаў.

Падрыхтавала Вера Чуйко

Заява Сойму БНФ пра III Ўсебеларускую Палітычную Канфэрэнцыю

Сойм БНФ "Адраджэньне" ацэньвае палітычную сытуацыю ў краіне як санкцыянаваны ўладамі наступ камуністычнае антынезалежніцкае рэакцыі. Сойм пацьвярджае немагчымасьць удзелу БНФ у арганізацыі ды правядзеньні ў гэтых умовах зьезду беларусаў сьвету, бо такі зьезд, паколькі за яго арганізацыю бяруцца пракамуністычныя ўладныя структуры, будзе выкарыстаны імі дзеля сваіх інтарэсаў.

Сойм БНФ падтрымлівае прапанову Выканкаму БСДГ наладзіць улетку 1993 г. III Ўсебеларускую Палітычную Канфэрэнцыю, у якой узялі б удзел прадстаўнікі беларускіх дэмакратычных сілаў Бацькаўшчыны і замежжа. У гісторыі дэмакратычнага руху Беларусі Палітычныя Канфэрэнцыі склікаліся ў нялёгкія, паваротныя для нашага народу часіны. Гэткі ж час прысьпеў і цяпер.

Сойм прапануе вынесьці на абмеркаваньне III Ўсебеларускае Палітычнае Канфэрэнцыі галоўнае пытаньне: лёс незалежнасьці Беларусі й дэмакратычных пераўтварэньняў у нашай краіне. Разам зь іншымі беларускімі дэмакратычнымі сіламі Беларускі Народны Фронт удзельнічае ў падрыхтоўцы й правядзеньні Канфэрэнцыі.

г. Менск, 13 сакавіка 1993 г.

З радаў Фронту

МАГІЛЕЎ

У вапошні зімовы дзень Рада Магілеўскай арганізацыі БНФ "Адраджэньне" склікала канфэрэнцыю. У гарадзкім Доме культуры сабраліся 83 дэлегаты, госьці.

Пасьля малебну на добрую працу, праведзенага праваслаўным сьвятаром, са спавешчаньнем пра работу арганізацыі выступіў старшыня яе рады – Анатоль Фёдараў. Перш-наперш ён праналізаваў адстаўку мэра Магілева Сяргея Габрусева. У свой час Беларускі Народны Фронт падтрымаў Габрусева, хаця ён ніколі ня быў лідэрам дэмакратычнага руху, які ў Магілеве быў яшчэ вельмі слабы. С.Габрусеў тады кіраваў адным з вытворчых участкаў камбіната "Хімвалакно" і, паводле яго заяваў, разумеў неабходнасьць дэмакратычных пераўтварэньняў у краіне. Але пасьля абраньня старшынёй Магілеўскага гарвыканкаму С.Габрусеў перастаў супрацоўнічаць з Народным Фронтам, з дэмакратычнымі дэпутатамі. Ён не падтрымаў заяву БНФ пра падзеі ў Вільні, адмовіўся падпісаць заяву супраць ГКЧП, выступіў супраць страйкавага руху, супраць правядзеньня рэфэрэндуму. Выявіліся рвзыходжаньні і ў іншых выпадках. І тады Магілеўская гарадзкая арганізацыя БНФ выказала С.Габрусеву палітычны недавер.

Але мэр Магілева не зьвяртаў увагі на крытыку, а дзейнічаў так, як дзейнічае ўсюды партнамэнклятура. А таму неўзабаве выявілася, што мэр памяняў кватэру, у прэстыжным раёне Магілева пачаў будаваць сабе катэдж – выбухнуў скандал, які сродкі інфармацыі падалі як злоўжываньні мэра-дэмакрата, лідара дэмакратычнага руху Магілева. Выкарыстаньне службовага становішча – звычайная зьява ў карумпаваных Саветах, але газэты і радыё асабліва вылучалі слова – дэмакратычны. Намэнклятура спадзявалася, што выпадак з С.Габрусевым вельмі зашкодзіць дэмакратычнаму руху ў Магілеве, а то й спыніць яго. Але параза С.Габрусева стала перамогаю перш за ўсё Магілеўскай арганізацыі БНФ. Гэта – маральная перамога. Народны Фронт, усе дэмакратычныя арганізацыі засьведчылі сваю сумленнасьць, не захацелі дзеля выгады (напачатку на мэра–дэмакрата аглядваліся кіраўнікі аблвыканкаму, і апазыцыя пачувалася мацней) здраджваць сваім ідэалам. А таму і прагаласавалі супраць Габрусева 32 дэпутаты дэмклюбу.

Ці ня можа паўтарыцца такі выпадак у будучыні, – пыталі Анатоля Фёдарава пазьней. На гэты конт лепш за ўсё адказвае беларуская прыказка "За аднаго бітага дзесяць нябітых даюць". Старшыня рады лічыць, што памылка дапаможа ім быць больш сталымі. На той час не было магчымасьці выбіраць, але за гады людзі здолелі праявіць сябе, паказалі свае станоўчыя ці адмоўныя рысы.

Спадар Фёдараў распавёў прысутным пра канцэпцыю палітычнай дзейнасьці Магілеўскай гарадзкой арганізацыі БНФ. Ён перакананы, што трэба разьвіваць і ўдасканальваць арганізацыйныя структуры. "Мы распачалі працу, – сказаў старшыня, каб усюды, у кожным раёне, у кожнай вёсцы былі нашыя арганізацыі. Ужо сёньня ў 19 раёнах з 20-ці ёсьць структуры БНФ... З таго часу, як пачалі ўзьнікаць страйкавыя камітэты, мы падтрымліваем стварэньне свабодных прафсаюзаў, усе іхныя акцыі і сёньня маем у горадзе Магілеве адну з найбольш моцных арганізацыяў. Рабочыя камітэты павінны быць на кожным прадпрыемстве..." (Сёньня ў Магілеве дзейнічае каля трох дзясяткаў арганізацыяў, рухаў і партыяў дэмакратычнага кірунку. Прадстаўнікі шмат якіх выступілі на канфэрэнцыі.)

Рада Магілеўскай гарадзкой арганізацыі БНФ вырашыла перавесьці дзейнасьць на прафэсійную аснову. Ствараецца апарат, які будзе весьці арганізацыйную і агітацыйную работу, прапаганду. Магілеўскія лідары БНФ перакананыя, што толькі арганізацыя прафэсійных палітыкаў зможа павялічваць колькасьць прыхільнікаў, якія ня проста чымсьці не задаволены, але могуць штонебудзь прапанаваць, больш канструктыўна працаваць у час выбарчай кампаніі.

Магілеўскія сябры ствараюць свой інфармацыйна-выдавецкі цэнтар. Газэта "Ратуша" ўжо дасягнула прафэсійнага ўзроўню. Як дадатак да яе выходзяць газэты шасьці раёнаў, а ў Хоцімску, прыкладам, выдаецца асобная газэта дэмакратычнага кірунку. Такія выданьні, перакананы сп. Фёдараў, будуць ў кожным раёне. Пададзеныя дакумэнты на рэгістрацыю сваёй радыёстанцыі, вядуцца перамовы, каб выкарыстаць кабельнае тэлебачаньне. А дзеля забесьпячэньня праграмы дзейнасьці сродкамі Магілеўская арганізацыя БНФ наладжвае сувязь з камэрцыйнымі структурамі. Яна падтрымлівае ўсе грамадзкія арганізацыі, што ставяць за мэту нацыянальнае адраджэньне, творчыя калектывы. Для школаў купляюць кніжкі, дапамагаюць настаўнікам беларускамоўных клясаў. У Магілеве створана філія Беларускага гуманітарна-адукацыйнага культурнага цэнтру й ліцэю пры ім, выклад-чыкі тут – сябры БНФ.

Наладжана супрацоўніцтва з царквою, ды асабліва з касьцёлам, дзе на беларускай мове вядзецца багаслужба, працуе нядзельная школка. З дапамогай касьцёлу пасылалі дзяцей на аздараўленьне ў Польшчу. У горадзе ствараецца ўніяцкая грамада.

Больш падрабязна пра газэту "Ратуша" распавёў яе рэдактар Алесь Сердзюкоў. З рэдакцыяй стала супрацоўнічаюць сябры ўсіх партыяў, таварystваў, суполак Магілева. Ва ўсіх раёнах вобласьці ёсьць няштатныя карэспандэнты. Наладжана сувязь зь беларускімі суполкамі ў іншых гарадох Беларусі, у Маскве, Санкт-Пецярбурзе, Вільні.

Алесь Сердзюкоў выказаў сваё меркаваньне пра адстаўку Габрусева: "Мы не стварылі альтэрнатывы, мы паставілі на аднаго чалавека – і атрымалі такі вынік. Наогул, усякі чалавек дэмакратычных поглядаў, калі ён трапляе ў карумпаваныя органы, вымушаны жыць паводле іх законаў... Гэтую савецкую ўладу рэфармаваць нельга – яна ня мае пэрспэктывы... Мы павінны разьвіваць мясцовае самакіраваньне".

Амаль усе, хто выступаў на канфэрэнцыі, гаварылі пра Габрусева. Яго і хвалілі, і крытыкавалі, і шкадавалі. Так, шкадавалі яго як чалавека, які ня вытрымаў і здрадзіў сабе самому, спачувалі яму, таму што Габрусеў застаўся адзін. Дэпутацкі дэмакратычны клюб ня мог яго падтрымаць: дзеяньні Габрусева не адпавядалі іх прынцыпам. Партнамэнклятура яго баялася, а да таго ж ёй хацелася дыскрэдытаваць дэмакратычны рух Магілева, лідарам якога ўсё ж бачылі Габрусева. І хоць былы мэр фактычна спрыяў партнамэнклятуры і нават, як паказалі выступоўцы, напярэдадні адстаўкі спрабаваў заручыцца яе падтрымкай, ім ахвяравалі...

Не пачуў я на канфэрэнцыі, ды і пасьля яе, калі сардэчныя жанчыны з Камітэту "Дзеці Чарнобыля" частавалі нас вельмі смачнымі пірагамі й гарбатай, ні ад кога злосных словаў на Габрусева. І таму я перакананы, што ў Магілеўскай гарадзкой арганізацыі Беларускага Народнага Фронту пераважаюць людзі, якім баліць ня толькі за праведнікаў, але й за кожнага чалавека.

У той дзень абралі дэлегатаў на абласную ўстаноўчую канфэрэнцыю і дэлегатаў на III зьезд БНФ "Адраджэньне". Старшыняваць у Магілеўскай гарадзкой арганізацыі БНФ зноў даручылі Анатолю Фёдараву.

Гасьцямі канфэрэнцыі былі і выступілі перад дэлегатамі сябры Сойму БНФ Юры Хадыка ды Сяргей Мурог.

Пётра Станкевіч

ДАРАГІЧЫН

Чарговы раз пераконваюся: калі ёсьць нейкія адметнасьці ў палешукоў, дык гэта не этнічныя адрознасьці, не пачутыя мной аднаго разу разважаньні пра адметныя ўзоры на падэшвах іхных ног, а грунтоўнасьць і самавітасьць у характары, у падыходзе да кожнае справы. Горад Дарагічын – лішняе таму пацьверджаньне. Палітычных аб'яднаньняў тут усяго два, але рэальныя. Летась зарэгістравала сваю дзейнасьць Дарагічынскае аддзяленьне БНФ, а нядаўна, у лістападзе, адбыўся сход па аднаўленьні раённай партарганізацыі камуністаў. Менавіта па аднаўленьні, а не стварэньні новай, – падкрэсьлівалася ў прэсе, бо нават і на чале яе застаўся той жа першы сакратар – Барыс Асаўцоў. Праўда, партыйная пасада цяпер ня вызваленая, яе даводзіцца спалучаць з працаю намесьнікам старшыні райсельгасхарчу, дый камуністаў у раёне паменела – іх цяпер 70. Дарагічын – адзін зь нямногіх гарадоў, дзе былая партнамэнклятура не сыйшла ў цень, а ўзначаліла новыя камуністычныя структуры. Перакананьні тут мяняюць нячаста.

Але бывае, што і так здараецца. Горад Дарагічын вядомы ў найноўшай гісторыі Беларусі тым, што адсюль родам лідар грамадзка-культурнага аб'яднаньня "Палісьсе" Мікола Шаляговіч. У адзін зь ягоных прыездаў да сваякоў зь ім, тады яшчэ сябрам БНФ, навязалі лучнасьць актывісты дэмакратычнага руху Дарагічынскага раёну. Паўстаўшы ў 1988 годзе, гэтая суполка даўно шукала кантактаў зь менскімі й берасьцейскімі структурамі Фронту, і Мікола Шаляговіч адыграў ва ўяўленьні дарагічынскіх дэмакратаў ролю "чалавека з цэнтру". Так сталася, што тутэйшая Рада БНФ мела некаторы час выгляд Дарагічынскае гуртыны ГКА "Палісьсе". Аднак пікетаваньне, прыкладам, сэсіі Пінскага гарсавету пад лёзунгамі: "Палешукі! Ня будзьце паддосьледнымі трусікамі экспэрымэнту пад назвай "белорусизация!", іншыя выказваньні й дэмаршы лідара "Палісься", якія дазволілі трактаваць ягоную дзейнасьць як раскольніцкую ў дэмакратычным руху, выклікалі незадаволенасьць у сяброў Дарагічынскае, Яноўскае і Пінскае гуртынаў. Сябры Дарагічынскае гуртыны на чале са старшынёй Кастусём Мысьліўцом абвясьцілі пра выйсьце з аб'яднаньня. Праўда, паводле сьцверджаньня намесьніка старшыні ўправы ГКА "Палісьсе" Аляксандра Трушко, Дарагічынская гуртына 29 красавіка 1991 году рашэньнем управы была расфармаваная за дзейнасьць, супярэчную Статуту аб'яднаньня, а менавіта (цытую) "за дзейнасьць у стылі і ў інтарэсах БНФ". Як бы гэта ні было на справе, але пра тое, што шляхі лідара "Палісься" і Дарагічынскае суполкі не супадаюць – сьведчыць далейшы хаўрус Міколы Шаляговіча з камуністамі, ў той час як колішняя Дарагічынская гуртына атрымала рэгістрацыйнае пасьведчаньне БНФ.

Тутэйшае аддзяленьне Фронту мае больш як 180 чалавек, прычым ня толькі ў Дарагічыне, але і ў раёне: вёсках і мястэчках Аляксеевічы, Застаўе, Антопаль і іншых. Наяўнасьць гэткае масавае сілы ў раёне стварае тут асаблівы палітычны мікраклімат. Так, на выбарах у Вярхоўны Савет Беларусі, перамогшы намэнклятурных кандыдатаў, прайшоў дырэктар школы Аляксей Ніканчук, які дакляраваў прыхільнасьць да прынцыпаў БНФ. Цяпер, праўда, ён культывуе імідж незалежнага дэпутата, аднак тутэйшай Радзе Фронту дапамагаць час ад часу мусіць. Нейк стыхійна, нават без асаблівых намаганьняў БНФ, сталася так, што ў гарсавеце больш за палову дэпутатаў склалі дэмакраты. А год таму на новага старшыню гарвыканкаму быў абраны 29-гадовы Іван Ярашэвіч, які хаця й меў гарт працы ў камсамоле, школаю гэтаю не сапсаваны. 9 студзеня гарвыканкам даў сваю залу паседжаньняў дзеля сходу ўпаўнаважаных прадстаўнікоў Дарагічынскага аддзяленьня БНФ, выступіў на сходзе і мэр. Падрыхтоўка да збору ішла грунтоўна – гэта была свайго роду раённая канфэрэнцыя. Вясковыя суполкі паводле пэўных квотаў вылучылі прадстаўнікоў – 51 чалавека. Парадак дня таксама быў прапанаваны важкі. Мяйсцовыя сябры Фронту, самавітыя палешукі, адчуваючы непазьбежнасьць пераняцьця ўлады ў раёне, загадзя, паволі ўваходзяць у курс справаў. Сход упаўнаважаных, не раўнуючы як сэсія райсавету, абмеркаваў: ролю афіцыйных прафсаюзаў на цяперашнім этапе, пытаньне пра зямлю, пра жыльлёвае будаўніцтва ў раёне, пра мову і культуру.

Гутарка аб прафсаюзах зайшла невыпадкова. Менавіта цяпер, калі на прадпрыемствах распачалася кампанія справаздачна-выбарчых сходаў і заключэньня новых калектыўных дамоваў, Дарагічынскі БНФ вырашыў пашырыць уплыў на прафкамы і, па магчымасьці, паўсюдна правесьці туды сваіх лідараў. Праграма-максымум – падпарадкаваньне Фронту прафсаюзных структураў і паступовы вывад іх з падначаленьня адміністрацыі – мае зьдзяйсьніцца на выключна законных падставах; мэханізм такіх дзеяньняў растлумачыў на сходзе юрысконсульт Міхаіл Бажко. З інфармацыяй пра жыльлёвае будаўніцтва выступіў старшыня гарвыканкаму. Прынялі пастановы наконт прыватызацыі жыльля, бясплатнай раздачы зямлі. Выказаліся і за тое, каб дзяржаўнаю моваю лічыць беларускую, а мяйсцовы палескі дыялект – захоўваць і шанаваць. Ня маючы пакуль што заканадаўчых правоў, прапановы перадалі свайму дэпутату Аляксею Ніканчуку, які паабяцаў на сэсіі Вярхоўнага Савету галасаваць за пункты, адпаведныя пастанове Дарагічынскага сходу. Так паволі, разважна Дарагічынскі БНФ вучыцца кіраваць, рыхтуючы сябе да выпрабаваньня ўладаю.

Наш Кар.

Навіны БНФ № 3(38), 1–25 сакавіка 1993

«Абудзілася Беларусь да

Дакумэнты

ПРИКАЗ РУССКИМ ВОЙСКАМ РУМЫНСКОГО ФРОНТА

9 января 1918 года, № 1332

Объявляю об учреждении Белорусской Войсковой Комиссии по организации белорусских воинских частей на румынском фронте.

В состав означенной комиссии вошли:

1) Председатель Генерал-Майор Пожарский,

2) Секретарь Поручик 117 пехотного Ярославского полка Ленчиони,

3) Члены: Подполковник 4 Морского полка Чунихин,

4) Штабс-Капитан 481 пехотного Мешевского полка Манцевич,

5) Штабс-Ротмистр 11 Изюмского Гусарского полка Пожарский,

6) Поручик 117 пехот. Ярославского полка Горянский,

7) Подпоручик 117 пех. Ярославского полка Горянский,

8) Представитель фронтовой Белорусской Рады по назначению последней.

Вышеупомянутая комиссия помещается при Штабе Румфронта, куда всем воинским чинам и учреждениям в подлежащих случаях и надлежит обращаться. Телеграфный адрес комиссии: Штарум, Белорусская комиссия.

Подписал: помощник Августейшего Главнокомандующего армиями Румынского фронта Генерал-от-Инфантерии Щербачев (по управлению Генерал-Квартирмейстера).

ПРИКАЗ РУССКИМ ВОЙСКАМ РУМЫНСКОГО ФРОНТА

14 января 1918 г., № 1362

Согласно постановлению Комитета Национально-Областных комиссаров при Штабе Румынского фронта приказываю 6-й Таурогенский пограничный конный полк белоруссизовать, для чего, распоряжением Штаба 6-й армии, собрать все находящиеся в отделе эскадроны вместе и расположить в деревнях Болгарийки и Табаки.

Указанному полку с сего числа именоваться «Первым Гусарским Белорусским национальным полком».

Основание: отношение Председателя Комитета Национально-Областных Комиссаров при Штабе Румынского Фронта за № 298 и отношение Председателя Белорусской Войсковой Комиссии по организации белорусских воинских частей на Румфронте за № 1.

Подписал: Помощник Августейшего Главнокомандующего армиями Румынского фронта Генерал-от-Инфантерии Щербачев (по управлению Дежурного Генерала).

ПРИКАЗ РУССКИМ ВОЙСКАМ РУМЫНСКОГО ФРОНТА

21 января 1918 г., № 1399

Согласно постановления Комитета Национально-Областных Комиссаров при Штабе Румынского фронта, приказываю:

1) 4-й армейский корпус в составе 30 и 40 пехотных дивизий с их артиллерией, Штаб корпуса и все приданные корпусу вспомогательные части и учреждения, 43 п. дивизию с её артиллерией и приданными ей учреждениями и 26 авто-броневое отделение – белоруссизовать.

2) Всех офицеров и солдат белоруссов распоряжением Штабов армий передать соответственно: из 4-й и 6-й армий в 4 армейский корпус, а из 8 и 9 армий – в 43 п. дивизию.

Всех же чинов не белоруссов, состоящих в настоящее время в указанных частях, в случае их желания, выделить и передать распоряжением штабов 6 и 9 армий в другие не национализируемые части.

Основание: отношение Председателя Комитета Национально-Областных Комиссаров за №№ 281 и 280.

Подписал: Помощник Августейшего Главнокомадующего армиями Румынского фронта, Генерал-от-Инфантерии Щербачев.

ПРИКАЗ РУССКИМ ВОЙСКАМ РУМЫНСКОГО ФРОНТА

23 января 1918 г., № 1407

Приказываю 357-ю Витебскую и 401-ю Минскую дружины – белоруссизовать.

Основание: отношение Комиссара по Белорусским делам Румынского фронта с. г. за № 113.

Подписал: Помощник Августейшего Главнокомандующего армиями Румынского фронта, Генерал-от-Инфантерии Щербачев (по управлению Дежурного Генерала).

1918 г., января 30 (февраля 12).

Да 75-годзьдзя абвешчаньня Беларускае Народнае Рэспублікі

Шлях нашага народу да незалежнасьці вёў праз тры – 1794, 1831 ды 1863–1864 гадоў – паўстаньні. Ды хоць удзельнікаў апошняга пакаралі найсуровей, праз паўстагодзьдзя "абудзілася Беларусь да дзяржаўнага жыцьця".

У беларускіх гарадох, у войску (а на франты Першае сусьветнае вайны паслалі амаль палову дарослых беларусаў), сярод уцекачоў, высланых у Расею, зьявіліся палітычныя, культурна-асьветніцкія ды ўцякацкія арганізацыі. Прыкладам, тады было

Беларускае Вайсковае Цэнтральнае Рады пераняць уладу на тэрыторыі этнаграфічнае Беларусі.

27 кастрычніка 1917 году ад імя Вялікае Беларускае Рады (ВБР), Беларускае Вайсковае Цэнтральнае Рады, Беларускае

Сябры Вялікае Беларускае Рады і Беларускае Вайсковае Цэнтральнае Рады. Менск, кастрычнік 1917 г. Надпіс "Няхай жыве вольная Беларусь" на харугве вышыла Зоська Верас. За копію здымку дзякуем Цэнтральнаму дзяржаўнаму архіву-музэю літаратуры і мастацтва Беларусі.

Першаю палітычнаю суполкай, якая мела за мэту абарону нацыянальных правоў нашага народу, была Беларуская рэвалюцыйная грамада. Яе стварылі Вацлаў Іваноўскі, браты Іван ды Антон Луцкевічы. Гэтая партыя ўзьнікла ў 1902 г. і на першым сваім зьездзе ў

Тамаш Грыб

1903 г. пачала называцца Беларускаю сацыялістычнаю грамадою (БСГ). Яе ідэі прапагандавалі газэты "Наша Доля" і "Наша Ніва".

Пасьля лютаўскае рэвалюцыі 1917 году БСГ актывізавала сваю дзейнасьць. На той час

заснаванае і актыўна дзейнічала Беларускае таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны. У Віцебску ўзьнік Беларускі народны саюз, у Гомлі – Саюз беларускай дэмакратыі. У сакавіку 1917 году на першым зьездзе нацыянальных арганізацыяў (150 удзельнікаў) былі абраны Беларускі Нацыянальны Камітэт (БНК) з 18 чалавек. Яму даручалася ў кантакце з часовым урадам арганізаваць "Беларускі краёвы ўрад".

На зьездзе прадстаўнікоў беларускіх арганізацыяў і партыяў 8 ліпеня 1917 году ў Менску была створана Цэнтральная Рада беларускіх арганізацыяў, якая прыняла свой статут. У яе выканаўчым камітэце прадстаўнікі БСГ мелі кіраўнічую ролю. Улетку таго ж году ў Вільні ўзьнікла беларуская арганізацыя "Сувязь незалежнасьці і непадзельнасьці Беларусі". Яна выступала супраць канфэдэрацыі Беларусі зь Літвою і супраць аўтаноміі Беларусі ў складзе Расеі.

У кастрычніку 1917 году ў Менску сабраўся зьезд жаўнераў-беларусаў трох арміяў Заходняга фронту, на якім была абраная Беларуская Вайсковая Цэнтральная Рада (БВЦР). Яна мела за мэту стварэньне беларускага войска. Адбыліся таксама зьезды вайскоўцаў франтоў: Паўночнага – у Віцебску, Румынскага – у Адэсе, Паўднёва-Заходняга – у Кіеве. Прадстаўнікі зьездаў увайшлі ў склад БВЦР.

З 14 па 26 кастрычніка ў Менску адбыліся III зьезд БСГ і II сэсія Цэнтральнае Рады беларускіх арганізацыяў. На аб'яднанай нарадзе іхныя прадстаўнікі вырашылі стварыць свой найвышэйшы орган – Вялікую Беларускую Раду (ВБР). Як пісаў Язэп Варонка, яна павінна была з дапамогаю

Сацыялістычнае Грамады ды іншых арганізацыяў была абвешчана "Грамата да беларускага народу", у якой выказвалася адмоўнае стаўленьне да бальшавіцкага перавароту, а беларусаў перад небясьпекай анархіі заклікалі аб'яднацца ды утрымаць лад і згоду ў краіне.

Напярэдадні на аб'яднанай нарадзе магілеўскіх беларускіх нацыянальных арганізацыяў рэдактар "Могилёвского вестника" былы інспэктар народных вучэльняў Міхал Кахановіч, старшыня Магілеўскае Беларускае Рады, сказаў: "Бальшавіцкае паўстаньне – гэта злачынства, бо пасьля яго лёгка можа вярнуцца былы рэжым".

Газэты "Вольная Беларусь", "Беларуская рада", "Бюлетэнь Беларускай Рады 10-й арміі" пачалі прапаганду супраць бальшавікоў, тлумачылі народу сутнасьць савецкай улады, заклікалі браць прыклад з Украіны, Сібіры, данскіх казакоў. Адначасова прапагандавалася ідэя склікаканьня Ўстаноўчага сходу, каб захаваць правы й вольнасьці, заваяваныя ў лютым. ВБР пачала актыўныя захады, каб стварыць беларускае войска. (2 сьнежня 1917 г. Аблвыкамзах – Выканаўчы камітэт Савету рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Заходняй вобласці і фронту, які ўстанавіў савецкую ўладу на тэрыторыі Беларусі, вырашыў не дапусьціць фармаваньня беларускіх частак.)

Але беларускія нацыянальныя групоўкі не адмовіліся ад змаганьня супраць дыктатуры бальшавікоў, за дэмакратыю, за самавызначэньне. Пачалася падрыхтоўка да скліканьня Ўсебеларускага зьезду.

Дзяржаўнага жыцьця»

Ініцыятарамі выступілі Вялікая Беларуская Рада ў Менску і Беларускі абласны камітэт пры Ўсерасейскім Савеце сялянскіх дэпутатаў (Белабласткам) у Петраградзе.

Выканаўчы камітэт ВБР, Беларуская Цэнтральная Вайсковая Рада і Беларускі выканаўчы камітэт Заходняга фронту ў звароце "Да ўсяго беларускага народу" прапанавалі склікаць 5 сьнежня 1917 году ў Менску зьезд прадстаўнікоў усяго беларускага народу, каб утварыць органы ўлады ў цэнтры й на месцах. У бюро скліканьня зьезду ўвайшлі і прадстаўнікі Белабласткаму, старшыня якога, аграном родам з Рэчыцкага павету Е.Канчар сьцьвярджаў, што ў стварэньні Савету Народных Камісараў Заходняй вобласьці "ні беларускія часткі, ні беларускія Саветы сялянскіх і рабочых дэпутатаў ня ўдзельнічалі. Аблвыкамзах не прадстаўляе беларускіх працоўных і дзейнасьць яго не адпавядала мясцовым патрэбам, а ўлада яго разумелася абмежаванаю Заходнім фронтам".

Белабласткам у Петраградзе зьвярнуўся праз Наркамнац у Савет Народных Камісараў РСФСР з просьбай матэрыяльна падтрымаць Усебеларускі зьезд. СНК РСФСР задаволіў гэтую просьбу і праз Наркамнац выдзеліў грошы на правядзеньне зьезду.

8 сьнежня 1917 году на Першы Ўсебеларускі кангрэс у Менск зьехаліся прадстаўнікі Вялікае Беларускае Рады, Беларускае Цэнтральнае Вайсковае Рады, беларускіх выканаўчых камітэтаў усіх франтоў, Беларускае выканаўчае камісіі ў Маскве, дэпутаты Ўстаноўчага сходу (Учредительного собрания) ад Беларусі, Беларускае Сацыялістычнае Грамады, дэлегаты іншых



Першы Ўрад БНР. Сядзяць: злева направа – А.Бурбіс, І.Серада, Я. Варонка, В.Захарка. Стаяць: Злева направа – А.Смоліч, П.Крэчэўскі, К.Езавітаў, А.Аўсянік, Л.Заяц.

партыяў, беларусы – сябры Выканаўчага камітэту Ўсерасейскага Савету сялянскіх дэпутатаў, прадстаўнікі губэранскіх, павятовых і валасных земстваў, беларускіх уцякацкіх ды іншых таварыстваў і суполак. З 1872-х дэлегатаў 1167 мелі права вырашальнага голасу. 22 адсоткі дэлегатаў прадстаўлялі нацыянальную інтэлігенцыю: настаўнікаў, юрыстаў, журналістаў, вучоных, а таксама афіцэраў; 8 адсоткаў – вышэйшае афіцэрства, буйных землеўладальнікаў, сьвятароў, а рэшта – сяляне, жаўнеры, рабочыя.

Зьезд прыняў рэзалюцыю, у якой права вырашаць лёс беларускага народу надавалася будучаму Ўстаноўчаму сойму. А пакуль на кароткі час улада перадавалася Ўсебеларускай Радзе сялянскіх, жаўнерскіх і рабочых дэпутатаў.

Як вядома, прэзыдыюм Першага Ўсебеларускага Кангрэсу быў арыштаваны бальшавікамі ад імя СНК Заходняй вобласьці і фронту. Але большасьць удзельнікаў зьезду не падпарадкаваліся гвалту менскіх бальшавікоў. Ужо раніцай 18 сьнежня яны сабраліся ў дэпо Лібава–Роменскай чыгункі і працягвалі паседжаньне, на якім вырашылі не прызнаваць улады гвалтаўнікоў ды заклікаць увесь беларускі народ змагацца з гэтай уладай.

21 сьнежня на патаемным сходзе Рада зьезду вылучыла з свайго складу Выканаўчы камітэт Першага Усебеларускага Кангрэсу і абавязала яго прыняць на сябе функцыі выканаўчай улады на Беларусі, калі створыцца рэальная магчымасьць існаваньня такой улады. Старшынёй Выканаўчага камітэту абралі Язэпа Варонку, які, хаця яго двойчы арыштоўвалі, кіраваў дзейнасьцю камітэту.

Уся ўвага была скіравана на стварэньне самастойнае дзяржавы. Дзеля гэтага камітэт пачаў актыўна супрацоўнічаць з Украінскаю Радаю. На Румынскім фронце было створана беларускае войска.

18 лютага 1918 году нямецкае войска рушыла ў наступ на ўсім фронце. СНК Заходняй вобласьці і фронту 19 лютага пачаў эвакуацыю. У гэты ж дзень Выканаўчы камітэт утварыў Народны Сакратарыят Беларусі. 21 лютага ён зьвярнуўся да беларускага народу зь "Першаю Ўстаўною Граматаю".

Калі ў Менск увайшло нямецкае войска, Язэп Варонка быў прыняты прадстаўніком камандаваньня. Але немцы не прызналі беларускую ўладу – так яны абавязваліся паводле ўмоваў Берасьцейскага міру. Сакратарыят выгналі з занятага памяшканьня, а беларускі сьцяг зьнялі.

Але нацыянальныя дзеячы і ня думалі скарыцца. Яны аднавілі Беларускую Вайсковую Цэнтральную Раду, а пасьля зь меншавікамі, эсэрамі, бундаўцамі вырашылі абвясьціць Беларусь Народнаю Рэспублікаю. 9 сакавіка 1918 году Выканаўчы камітэт, якога ў свой час Кангрэс абавязаў узяць на сябе функцыі ўлады, зьвяртаецца да народу Беларусі з другою Ўстаўною Граматаю. Уся ўлада перадавалася Радзе Ўсебеларускага Кангрэсу, якая 18 сакавіка была ператворана ў Раду Беларускае Народнае Рэспублікі.

Увечары 24 сакавіка пачалося паседжаньне Рады БНР. Абмяркоўвалася прапанова Антона Луцкевіча абвясьціць незалежнасьць БНР. Раніцай 25 сакавіка 1918 году была прынятая Трэйцяя Ўстаўная Грамата: Беларусь абвяшчалася незалежнаю дзяржаваю.

П. С.

Дакумэнты

ПЕРШАЯ ЎСТАЎНАЯ ГРАМАТА

Да народаў Беларусі

Родная старонка наша апынулася ў новым цяжкім стане. Дзе цяпер улада, што была тут, няведама, мы стаімо перад тым, што наш край можа быць заняты нямецкімі войскамі. Мы павінны ўзяць свой лёс ва ўласныя рукі. Беларускі народ павінен зьдзейсьніць сваё права на поўнае самаазначэньне, а нацыянальныя меншасьці на нацыянальна-пэрсанальную аўтаномію. Правы нацыі павінны знайсьці сваё зьдзейсьненьне шляхам скліканьня на дэмакратычных асновах Устаноўчага Сойму. Але і да скліканьня Ўстаноўчага Сойму ўся ўлада на Беларусі павінна належыць тым народам, якія на ёй жывуць. Выканаўчы К-т Рады першага Ўсебеларускага Зьезду, папоўнены прадстаўнікамі рэвалюцыйнай дэмакратыі нацыянальных меншасьцяў, зьдзяйсьняючы мэты Зьезду, **абвяшчае сябе часовай уладай на Беларусі** для кіраваньня краем і скліканьня, як можна хутчэй, Усебеларускага Ўстаноўчага Сойму на аснове агульнага, простага, роўнага, тайнага і прапарцыянальнага выбарчага права для ўсякага дарослага, ня лічучыся з нацыянальнасьцю, вызьнаньнем і родам. Часовую народную ўладу краю, якая ставіць сабе мэтай абарону і зацьверджаньне заваяваньняў рэвалюцыі, будзе зьдзейсьняваць створаны намі Народны Сакратарыят Беларусі, які ад гэтага дня пачаў выконваць свае абавязкі. Пэрсанальны склад Сакратарыяту будзе апублікаваны пасьля.

Дадзена ў Менску-Беларускім
21 (8) лютага 1918 г.
Выканаўчы Камітэт Рады
Ўсебеларускага Зьезду.

ДРУГАЯ ЎСТАЎНАЯ ГРАМАТА

Да народаў Беларусі

У часе сусьветнай вайны, што бурыць адны моцныя дзяржавы і аслабляе другія, абудзілася Беларусь да дзяржаўнага жыцьця. Пасьля трох з паловаю вякоў няволі зноў на ўвесь сьвет кажа беларускі народ аб тым, што ён жыве і будзе жыць. Вялікі Народны Збор - Усебеларускі Зьезд 15-17 сьнежня 1917 году, дбаючы аб долі Беларусі, зацьвердзіў на яе землях рэспубліканскі лад. Выпаўняючы волю Зьезду і баронячы дзяржаўныя правы народу, Спаўняючы Камітэт Рады Зьезду гэтак пастанаўляе аб дзяржаўным устроі Беларусі і аб правох і вольнасьцях яе грамадзян і народаў:

1. – **Беларусь у рубяжох расьсяленьня і лічэбнай перавагі беларускага народу абвяшчаецца Народнаю Рэспублікай.**
2. – Асноўныя законы Беларускае Народнае Рэспублікі зацьвердзіць Устаноўчы Сойм Беларусі, скліканы на асновах агульнага, роўнага, простага, патаёмнага і прапарцыянальнага выбарчага права, не зважаючы на род, народнасьць і рэлігію.
3. – Да часу, пакуль зьбярэцца Устаноўчы Сойм Беларусі, законадаўчая ўлада ў Беларускай Народнай Рэспубліцы належыць Радзе Усебеларускага Зьезду, дапоўненай прастаўнікамі нацыянальных меншасьцяў Беларусі.
4. – Спаўняючая і адміністрацыйная ўлада ў Беларускай Народнай Рэспубліцы належыць Народнаму Сакратарыяту Беларусі, які назначаецца Радаю Зьезду і перад ёю трымае адказ.
5. – У рубяжох Беларускае Народнае Рэспублікі абвяшчаецца свабода слова, друку, сходаў, забастовак, хаўрусаў; бязумоўная свабода сумленьня, незачэпнасьць асобы і памешканьня.
6. – У рубяжох Беларускае Народнае Рэспублікі ўсе народы маюць права на нацыянальна-пэрсанальную аўтаномію; абвяшчаецца роўнае права ўсіх моваў народаў Беларусі.
7. – У рубяжох Беларускае Народнае Рэспублікі права прыватнае ўласнасьці на зямлю касуецца. Зямля перадаецца бяз выкупу тым, што самі на ёй працуюць. Лясы, вазёры і нутро зямлі абвяшчаюцца ўласнасьцю Беларускае Народнае Рэспублікі.
8. – У рубяжох Беларускае Народнае Рэспублікі ўстанаўляецца найбольш 8-гадзінавы рабочы дзень.

Абвяшчаючы ўсе гэтыя правы і вольнасьці грамадзян і народаў Беларускае Народнае Рэспублікі, мы, Спаўняючы Камітэт Рады Зьезду, абавязуемся пільнаваць законнага парадку жыцьця ў Рэспубліцы, сьцерагчы інтарэсы ўсіх грамадзян і народаў Рэспублікі і захаваць правы і вольнасьць працоўнага люду. А так сама даложым усіх сілаў, каб склікаць у найбліжэйшым часе Устаноўчы Сойм Беларусі.

Усіх верных сыноў Беларускае зямлі клічам памагчы нам у цяжкой і адказнай нашай працы.

Спаўняючы Камітэт Рады 1-га
Усебеларускага Зьезду.
Выдана ў Менску-Беларускім
9 сакавіка 1918 року.
БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ РЭСПУБЛІКА.

Народны Сэкратарыят
22 сакавіка 1918 г.,
Место Менск, № 43.

ТРЭЙЦЯЯ ЎСТАЎНАЯ ГРАМАТА

Год назад народы Беларусі разам з народамі Расіі скінулі ярмо Расійскага царызму, які найцяжэй прыціснуў быў Беларусь, ні пытаючыся народу, ён укінуў наш край у пажар вайны, якая чыста зруйнавала гарады і вёскі беларускія. Цяпер мы, Рада Беларускай Народнай Рэспублікі, скідаем з роднага краю апошняе ярмо дзяржаўнай залежнасьці, якое гвалтам накінулі расійскія цары на наш вольны і незалежны край. **Ад гэтата часу Беларуская Народная Рэспубліка абвяшчаецца незалежнаю і вольнаю дзяржавою.** Самі народы Беларусі, у асобі свайго Устаноўчага Сойму, пастановяць аб будучых дзяржаўных зьвязях Беларусі.

На моцы гэтага трацяць сілу ўсе старыя дзяржаўныя зьвязі, якія далі матчымасьць чужому ўраду подпісаць і за Беларусь трактат у Берэсьці, што забівае на сьмерць беларускі народ, дзелючы зямлю яго на часткі. На моцы гэтага ўрад Беларускай Народнай Рэспублікі мае ўвайсьці ў адносіны з зацікаўленымі старанамі, прапануючы ім перагледзіць тую часьціну Берэсьцейскага трактату, якая датычыць Беларусі, і падпісаць міравую ўмову з усімі ваяваўшымі дзяржавамі.

Беларуская Народная Рэспубліка повінна абняць усе землі, дзе жыве і мае лічбенную перавагу беларускі народ, а ласьне Магілеўшчыну, беларускіе часьці Меншчыны, Гродзеншчыны (з Гродняй, Белastокам і інш.), Віленшчыны, Віцебшчыны, Смаленшчыны, Чарнігаўшчыны і сумежныя часьці суседніх губэрныяў, заселеныя беларусамі.

Рада Беларускай Народнай Рэспублікі пацьверджае ўсе тыя правы і вольнасьці грамадзян і народаў Беларусі, якія абвешчаны Устаўнай граматай ад 9 сакавіка 1918 г.

Абвяшчаючы аб незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі Рада яе пакладае свае надзеі на тое, што ўсе любячыя волю народы дапамогуць беларускаму народу ў поўнай меры здзейсьніць яго палітычна дзяржаўныя ідэалы.

Рада Беларускай Народнай Рэспублікі
Дана ў Менску-Беларускім
25 сакавіка 1918 г.

Паводле збору дакумэнтаў "За Дзяржаўную Незалежнасьць Беларусі". Лёндан, 1960.

Афіцэры ў пікеце

У камітэт "Вяртаньне" зьвярнулася група вайскоўцаў з авіяцыйнай часткі, што ў Лідзе, па дапамогу. У 1989 годзе яны былі пераведзеныя з Заходняй групоўкі войска на Беларусь. Падчас прыняцьця закону "Аб грамадзянстве ў Рэспубліцы Беларусі" пакрыўджаныя знаходзіліся на яе абшарах і, зразумела, сталі грамадзянамі Беларусі. Афіцэры й прапаршчыкі служылі ды былі ўпэўненыя, што дзяржава іх абароніць. Да таго ж кіраўнікі Рэспублікі – Старшыня Савету Міністраў В.Кебіч і Старшыня Вярхоўнага Савету С. Шушкевіч – абяцалі знайсьці шляхі падтрымкі вайскоўцаў. Адно хвалявала жаўнераў – у іх ня было жытла. У вайсковым мястэчку, што праўда, будуюцца дамы і неўзабаве кватэры будуць. Але для каго?

20 ліпеня 1992 году было падпісана пагадненьне паміж Расеяй і Беларусьсю, у выніку якога на тэрыторыі нашай дзяржавы ўтварыліся войска Беларусі і войска Расеі. І, вядома ж, у расейскім войску апынуліся грамадзяне Беларусі, якіх ніхто не запытаў, ці жадаюць яны служыць чужой дзяржаве. У чужое войска яны трапілі за чужою згодай.

Цяпер, паводле дамовы, расейскае войска мусіць пакінуць абшары Беларусі. Вядома, Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусі ня хоча клапаціцца пра вайскоўцаў чужой краіны. А ў войску Расеі хапае сваіх пакрыўджаных ды бяздомных. Ці расейскім генэралам будзе справа да грамадзянаў чужое краіны?

І атрымалася, што вайскоўцы, якія так доўга чакалі абяцанага жытла, сёньня непатрэбныя ні на радзіме, на Беларусі, грамадзянамі якой яны зьяўляюцца, ні ў Расеі. Складаецца ўражаньне, што Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусі хоча вырашыць праблему жытла для адных афіцэраў свайго войска коштам крыўды для другой групы афіцэраў – грамадзянаў Беларусі.

Ці будзе бараніць правы чалавека наша маладая дзяржава? Ці патрэбныя Радзіме яе сыны, ці паклапоціцца яна пра іх? Ці будуць грамадзяне Беларусі выпраўленыя зь Беларусі разам з расейскім войскам? Гэтыя пытаньні гучалі 11 сакавіка перад будынкам Вярхоўнага Савету Беларусі, дзе ў пікетах стаялі афіцэры, прапаршчыкі ды іх сем'і.

Галіна Сямдзянава

Спрэчнае пытаньне

У НАС НЯМА МАГЧЫМАСЬЦЯЎ ДЛЯ ПРОСТЫХ РАШЭНЬНЯЎ

У распрацаванай БНФ канцэпцыі эканамічнае рэформы сфармуляваная мэта – стварэньне эфэктыўнай канкурэнтаздольнай эканомікі. Вызначаны і сродкі яе дасягненьня: упарадкаваньне дачыненьняў уласнасьці, антыманапольнае заканадаўства, сацыяльна збалянсаваная бюджэтная палітыка, незалежная крэдытна-фінансавая сыстэма. Аднак гэта палова справы. Канцэпцыі нестае прапановаў да структурнай перабудовы гаспадаркі Беларусі (вызначэньне шляхоў эканамічнай інтэграцыі Беларусі ў эўрапейскую гаспадарку), якія неабходна распрацаваць, каб надаць канцэпцыі замкнёны выгляд.

Калі мы хочам стаць сапраўды незалежнаю дзяржавай, правадзейным членам сусьветнага супольніцтва, дык нам трэба навучыцца жыць за кошт сваёй працы ў гэтым супольніцтве. Прадаваць тое, што ў нас ёсьць ці можа быць выраблена зь лішкам і высокай якасьці, ды купляць тое, чаго нестае. Сёньня, аднак, прадукцыя нашае гаспадаркі неканкурэнтаздольная ані на эўрапейскім, ані на сусьветным рынку. У нас няма за што купляць патрэбныя нам нафту, газ, жалеза, бавоўну і г.д., і наўрад ці ў блізкай будучыні мы здолеем пастаўляць нашыя МАЗы, трактары, тэлевізары, лядоўні, вылічальныя машыны і г.д. на Захад ці на Ўсход не па дэмпінгавых цэнах. І наогул, сусьветны рынак насычаны традыцыйнымі відамі тавараў і замежныя вытворцы ня будуць спрыяць наладжваньню вытворчасьці гэтых тавараў у нас.

Аднак шмат якія эўрапейскія краіны, прыкладам, Германія, Італія, Аўстрыя, краіны Цэнтральнай Эўропы, маюць патрэбу ў электрычнай энэргіі. Электраэнэргія неблагі тавар, адзін зь нямногіх, які мы можам выробляць на сусьветным узроўні і які, зьяўляючыся адным з галоўных падмуркаў цывілізацыі, мае, бадай што, неабмежаваную пэрспэктыву. Геаграфічнае становішча Беларусі дазваляе пастаўляць энэргію замежным спажыўцам з малымі стратамі. Да таго ж, пры наяўнасьці адносна танных і дастаткова кваліфікаваных працоўных рэсурсаў, дзеяздольнай вытворчай базы, радовішчаў алюмініевай сыравіны, высокая энэргазабясьпечанасьць Беларусі дазволіць стварыць спрыяльныя ўмовы для структурнае перабудовы нашае гаспадаркі з удзелам замежнага капіталу.

Аднак, як лічаць спэцыялісты, разьвіваць на Беларусі для гэтых мэтаў паліўную энэргетыку немэтазгодна. Па-першае, таму, што мы практычна ня маем ані каменнага вугалю, ані нафты, ані газу. А па-другое, гэта небясьпечна з экалягічных меркаваньняў. Для Беларусі электрычная энэргія можа стаць нацыянальным таварам і рухавіком уздыму эканомікі ў тым разе, калі выробляць яе будуць на атамных станцыях. Ва ўмовах нармальнай эксплюатацыі сучасных па канструкцыі рэактараў вытворчасьць электраэнэргіі на АЭС будзе больш экалягічнай, больш тэхналягічнай, больш эканамічнай, больш пэрспэктыўнай, чым на паліўных. Спэцыялісты гэта ведаюць і даказваюць.

Галоўная праблема атамнай энэргетыкі – бясьпека атамнай станцыі ў аварыйнай сытуацыі. Пытаньне ў тым, каб аварыя не перарасла ў катастрофу, як у Чарнобылі. Прапановы забараніць будаўніцтва новых АЭС, закрыць існыя, уяўляюцца нерэальнымі. Сёньня чалавецтва ня зможа існаваць бяз атамнай энэргіі. Таму і нам прыйдзецца будаваць. А калі не захочам, дык усё роўна зь цягам часу будзем акружаныя атамнымі станцыямі яшчэ больш, чым сёньня. Не атрымліваючы ніякіх выгадаў ад атамнай энэргетычнай тэхналёгіі, будзем спаўна атрымліваць сваю долю рызыкі. Таму трэба не адмаўляцца ад атамнай энэргетыкі, а нарошчваць намаганьні дзеля яе бясьпекі.

Наша канцэпцыя бясьпекі атамнай энэргетыкі будуецца на чатырох галоўных прынцыпах. Першы – буйнамаштабнасьць. Вялікія аб'ёмы вытворчасьці і эканамічнасьць дазволяць накіраваць неабходныя сродкі для распрацоўкі бясьпекі атамных станцыяў. Другі – незалежнасьць, што дазволіць самастойна прымаць рашэньні, кіруючыся ўласнай неабходнасьцю, выгадай, бясьпекай. Трэці – усталяваньне цывілізаваных дачыненьняў уласнасьці, што дазволіць стварыць умовы адказнасьці за бясьпечнае выкарыстаньне вытворчасьцяў – крыніцаў небясьпекі. Чацьверты – выкарыстаньне новых, падвышанай надзейнасьці, рэактараў чацьвертага пакаленьня.

Скептыкі могуць сказаць: рызыка катастрафічнай аварыі ўсё-такі застаецца. Так, іншага няма. Каб выжыць і стаць цывілізаванаю краінаю, давядзецца і рызыку прыняць, і адказнасьць на сябе ўзяць за прынятыя рашэньні. Альтэрнатывай гэтаму – бязьдзейнасьць, якая вядзе да яшчэ большае рызыкі марненьня і заняпаду нацыі.

Хацеў бы, каб мяне правільна зразумелі. Я не настойваю на гэтай прапанове. Настойваю на неабходнасьці пошукаў у кірунку наданьня ўстойлівасьці сацыяльна-эканамічнаму становішчу Беларусі, што немагчыма без вырашэньня фінансавай і энэргетычнай праблемаў. Ад дня сёньняшняга і на пэрспэктыву. Гэта падмурак вырашэньня ўсіх астатніх праблемаў. Частка такога рашэньня выкладзена тут у якасьці прапановы для абмеркаваньня.

Мечыслаў Бурак,
інжынэр, кандыдат
тэхнічных навук

Друкуючы артыкул сп. М.Бурака, рэдакцыя разумее, наколькі балючую для Беларусі, пацярпелай ад Чарнобыльскай катастрофы, праблему ўздымае аўтар. Разам з тым нельга не пагадзіцца са спадаром Бураком, што праблема пошукаў крыніцаў энэргіі для Беларусі вельмі актуальная. Таму запрашаем чытачоў "Навінаў" выказацца наконт пэрспэктываў разьвіцьця ядзернай энэргетыкі на Беларусі. Спадзяемся таксама атрымаць меркаваньні іншых спэцыялістаў, зь якімі пазнаёмім нашых чытачоў.

Залатая сярэдзіна?

На мінулым тыдні рэдакцыя "Навінаў БНФ" правяла ў Менску экспрэс-апытаньне, каб высьветліць ступень папулярнасьці ў грамадстве найбольш вядомых палітычных дзеячоў. Было зададзена адно пытаньне: "За каго б вы прагаласавалі на прэзыдэнцкіх выбарах?" Вынікі апытаньня ў працэнтах прыведзеныя ў табліцы.

Кандыдат	насельніцтва	студэнты	сярэдняе
1. В.Кебіч	8.0	7.5	8.0
2. З.Пазьняк	12.0	21.8	15.0
3. С.Шушкевіч	38.0	37.6	38.0
ухіліліся	43.0	33.0	39.0
разам апытана	344	133	

Апытаньне праводзілася па дзьвюх групах: насельніцтва наагул і студэнты. З табліцы відаць, што толькі ў З.Пазьняка папулярнасьць сярод студэнтаў крыху вышэй, чым наагул у насельніцтва. У астатнім рэйтынг папулярнасьці вядучых беларускіх палітыкаў на дзіва ўстойлівы. Па-ранейшаму застаецца вялікай доля насельніцтва, якое альбо абыякава ставіцца да палітыкі, альбо адмаўляе ў падтрымцы ўсім кандыдатам.

Лідаруе нястомны прапагандыст згоды С.Шушкевіч. Камуністы нічога ня могуць зрабіць зь яго папулярнасьцю, нягледзячы на тое, што ягоны подпіс стаіць на дакумэнце, які пахаваў Саюз.

Самы нізкі рэйтынг у дзелавога чалавека В.Кебіча. Трэба меркаваць, што скандалы, у якіх замяшаныя ягоныя сямейнікі, не дадаюць яму папулярнасьці.

Нельга згадзіцца зь "сярэдняю" папулярнасьцю лідара дэмакратычных сілаў З.Пазьняка. Набліжаецца час рашучых выпрабаваньняў, калі прайграньне дэмакратычных сілаў можа вельмі дорага каштаваць нашаму народу.

Мы заседзеліся...

Мой суразмоўца – **Яўген Шунейка**, сябра мастацкай камісіі БНФ, вядомы мастацтвазнаўца, вучоны энцыкляпэдычнага складу, мастак. Ён вярнуўся з Гданьску, дзе 14-18 студзеня прайшоў Першы Агульнапольскі фэстываль нацыянальных меншасьцяў.

В.Б. – Першы?

Я.Ш. – Так, першы. Палякі раней, безумоўна, ведалі пра свае нацыянальныя меншасьці, але ня было такога, каб прапагандаваць іхную культуру...

У Гданьску–Гдыні сабраліся прадстаўнікі меншасьцяў Польшчы: украінцы, немцы, цыганы, грэкі, нашыя суродзічы, запрасілі таксама беларусаў зь Менску. На БНФ прыйшло запрашэньне ад Польска-ўкраінскага таварыства. Такі фэстываль быў і нам дзіва, і палякам.

В.Б. – Чым жа "дзівілі" беларусы?

Я.Ш. – Мы з графікам Міхасём Баразном прывезьлі вялікую выставу сучаснага беларускага плякату. Настолькі вялікую, што не хапіла мейсца для выстаўной пляцоўкі. Паказвалі плякаты падчас творчых сустрэчаў, і творы нашых мастакоў выклікалі захапленьне. Дарэчы, кіраўніцтва мясцовага багатага на зборы Мастацкага музэю вельмі зацікавілася беларускім мастацтвам.

Прайшлі на біс рок-гурты "Мроя" і "Новае неба", зь цікавым спавешчаньнем выступіў на навуковай канфэрэнцыі гісторык Юрась Шаўцоў зь Вільні. Тэатар "Дзе–Я" паказаў спэктакаль паводле п'есы польскага драматурга Ёнаша Кофты "Імжа". Былі і беларуская тэатральная трупа "Балаган" зь Беластоку, і гданьская беларуская аматарская тэатральная суполка.

Спадабалася наведнікам фотавыстава Уладзімера Парфенюка.

В.Б. – Што было галоўнаю мэтаю вашае паездкі?

Я.Ш. – Заўсёды думаюць, што на захадзе нас могуць навучыць чаму-небудзь. Пэўная доля праўды ў гэтым ёсьць. Нам у будучыні прыйдзецца ладзіць нешта падобнае, мы ж таксама маем нацыянальныя меншасьці. Паводле пастулятаў БНФ, нормай зьяўляецца разуменьне нацыянальных меньшасьцяў, задавальненьне іх культурных патрэбаў. Нас зьдзівіла, што дэлегацыі ня былі афіцыйна прадстаўленыя падчас адкрыцьця. Часу і ўмоваў сустрэцца, пагаварыць, усталяваць кантакты ня было.

В.Б. – Хто пабываў у Гданьску, ніколі не забудзе гэты прыгожы горад-помнік. Што ўразіла на гэты раз?

Я.Ш. – Уразілі гербы на брамах. На адной убачыў гербавую кампазыцыю: польскі арол, два крыжы Гданьска, нямецкі арол, з-за крыла якога відаць руку зь мечам – дэталь Пагоні. Прусія ж была фэдэратыўнай зямлёй у Ягайлавай дзяржаве. Успомніліся цікавыя сувязі Гданьска зь беларускаю дзяржаваю ў XVI – XVIII ст. Менавіта праз гданьскі порт ішло на экспарт беларускае збожжа, драўніна, лён, воск ды іншыя тавары. Мы абышлі ўсе гатычныя бажніцы горада. Уразіў гмах касьцёла Найсьвяцейшай Дзевы Марыі. Гданьск не нагадвае ані Вільню, ані Менск. Тут пануе дух рацыяналізму, рэспэктабэльнасьці.

В.Б. – Ці не згубілася на гістарычным фоне "Салідарнасьць"?

Я.Ш. – Для нас гэта было вельмі важна. Мы цяпер разумеем, як ім было няпроста пачынаць, ахвяравацца. Гэты дух жыве. Мы пастаялі каля трох крыжоў, помніка рабочым, якіх пастраляла войска і паліцыя (мне прыгадаўся крыж у Курапатах). Гэта касьцёл пад адкрытым небам. Рэжым нішчыў уласны народ. Пры камунізьме танкі лёгка душылі людзей на вуліцах. І вось у Гданьску была адпрацаваная мадэль акупацыйнага страйку. Правільная тактыка – адна з асноваў перамогі.

В.Б. – А якое ўражаньне ад сучаснай Польшчы?

Я.Ш. – Я ўбачыў дзьве Польшчы. Дзе пушчаныя лейцы ініцыятыве, усё разьвіваецца. Але ёсьць Польшча з сацыялізму, з таго ладу жыцьця, з усёй апатычнасьцю і безгаспадарнасьцю. Ня хочацца казаць пра бруд, зашарпанасьць. Ёсьць "саўковасьць" сучаснай архітэктуры, такая казарменнасьць. Ёсьць бюракратычнасьць у адносінах. Ня было асаблівай увагі, зацікаўленасьці пазнаць нас.

В.Б. – Пра што яшчэ даведаўся?

Я.Ш. – Прыкладам, для мяне тэма драматычнае міграцыі ўкраінскага насельніцтва ў Польшчы, сарванага прымусова пасьля вайны са сваёй зямлі і расьселенага на адваяваных у немцаў землях, была зусім невядомая. Мне здалося, што ў дачыненьнях паміж нацыянальнасьцямі ў Польшчы пяройдзена пэўная псыхалягічная мяжа. Раней такі фэстываль здаваўся чымсьці неверагодным. Цяпер гэта не ўспрымалася як пагроза польскай дзяржаўнасьці. Імпрэзу фінансава падтрымаў урад, было афіцыйнае прадстаўніцтва, консулы, журналісты, тэлебачаньне. Але мясцовае моладзі было мала. Паверым тым, хто сьцьвярджаў, што для іх гэта нецікава. Ёсьць пэўная апатыя ў моладзі, як і ў нас. Але нас зьдзівіла, як кепска палякі арыентуюцца ў геаграфіі, мовах сваіх суседзяў.

В.Б. – Відаць, гэта грахі савецкага ўнітарызму?

Я.Ш. – Безумоўна. Адчуваецца, што зараз палякі цалкам павярнуліся на Захад. Ёсьць небяспека паступова пераўтварыцца ў правінцыйны варыянт амэрыканскае, нямецкае або якой іншае культуры. А ім дый нам трэба глядзець навокал. А што да фэстывалю, дык галоўнае – зрушылі. І мы заседзеліся на Беларусі, нас мала ведаюць. Мы павінны паказваць лепшае, што маем. Адыходзіць ад бальшавіцкай ізаляванасьці.

Гутарыў Валеры Буйвал.

Леанід Васільеў

Бедная Расея, няшчасныя расіяне...

Пра чужыя балячкі цяжка гаварыць адкрыта й крытычна, асабліва калі тыя, пра каго гаворыцца, іх не заўважаюць альбо лічаць за гонар. Тут вельмі каштоўны разважлівы погляд на самога сябе. Аднак імпэрская сьвядомасьць і рабалепства, выхаваныя стагодзьдзямі тыраніі, не спрыяюць такому погляду на Ўсходзе. Тых жа, хто адважыўся на самакрытыку (Пётр Чаадаеў, Аляксандар Радзішчаў і інш.), часта аб'яўлялі вар'ятамі. У беларусаў, дарэчы, адваротная хвароба самабічаваньня, якое ператвараецца часам у паталягічнае самаедзтва й мазахізм.

Цьвярозых развагаў пра сваё народнае становішча цяпер у Расеі мала чуваць. Тым больш каштоўна, калі такія меркаваньні зьяўляюцца. Меркаваньні людзей, што стараюцца больш уважліва зірнуць на гісторыю й будучыню сваёй краіны.

На гэтую тэму прапануем чытачам артыкул Леаніда Васільева "Бедная Расея, няшчасныя расіяне...", зьмешчаны ў чацьвертым нумары расейскага часопіса "Новое время" за 1993 год. Артыкул даецца ў скарочаным выглядзе. Мяркуем, што пасьля яго прачытаньня шмат што стане зразумела і ў беларускім жыцьці.

Адразу зазначу: ня ўсе расіяне, відаць, уважаюць сябе за няшчасных – нават сёньня. Што да Расеі, дык багацьці яе ў столькі разоў большыя, прыкладам, за японскія, наколькі японцы жывуць лепш, чым мы. Вынікае, што віною не галеча вялікай Расеі, а мы самі, расіяне. Думка ня новая. Але цяпер, калі пабольшала "патрыётаў", якія лічаць за вінаватых чужынцаў (нерасейцаў, не расіянаў), і што нядрэнна было б стварыць расейскую Расею толькі для расейцаў, варта йзноў вярнуцца да гэтай ідэі ды яшчэ раз узьняць праблему трагедыі рускіх. А разам зь імі ды ўсіх расіянаў, усяго насельніцтва Расеі.

Хто ж вінаваты, што мы няшчасныя?

Сэрвільны комплекс

Патрыятычныя групоўкі, людзі, каму душа баліць за Расею, крыўдуюць ды абураюцца, калі тэрмін "сэрвілізм" адносяць да расейцаў. Гэта ім уяўляецца звычайна непавагай да народу, а нават і наўмысным скажэньнем яго аблічча. Няўжо расейцы – рабы? Вымушаны тлумачыць, што сэрвільнасьць, ці, кажучы акадэмічнымі тэрмінамі, што йдуць ад Гегеля й Маркса, "пагалоўнае рабства" як сацыяпсыхалягічны стэрэатып паводзінаў, – уласьцівасьць, прытомная ня толькі расейцам. Гэта пэўны нарматыў паводзінаў на ўсім Усходзе, часткай якога, да таго ж вельмі адметнаю, ёсьць Расея.

Да слова, адметнасьць Расеі ў гэтым выпадку зусім не азначае, як геніяльна сфармуляваў Цютчаў, што "розумам Расею не спазнаць". Не настолькі ўжо гэта складана. Проста тыя, хто спрабуе гэта зрабіць, пераважна мала знаёмыя з тыповым Усходам ды сутнасьцю ўсходняга дэспатызму, усходняга грамадзтва. Ім няўцям: шмат чаго, што паводле гістарычных дакумэнтаў звычайна ўяўляецца нейкай адметнасьцю Расеі (адметнасьцю, заўважым, у параўнаньні з Эўропай) – гэта ўласьцівасьць або характэрная рыса менавіта ўсходняе структуры з тыповаю для яе загадна-адміністрацыйнаю формаю цэнтралізаванага кіраваньня і такога ж разьмеркаваньня. Расейцы звычайна называюць гэта загадкавым тэрмінам "соборность", а спэцыялісты даюць больш выразнае вызначэньне: калектывізм, карпаратыўнасьць – з праўным ды эканамічным прыгнётам асобы.

Хто скідаў шапку перад валадаром?

Тэзу – Расея паміж Усходам і Захадам, Расея – і Ўсход, і Захад (двухгаловы арол) – сёньня, пасьля знаёмства з творамі расейскіх мысьляроў XX стагодзьдзя, асабліва Бярдзяева, можна лічыць прызнанаю. Але ці прызнаныя або прынамсі ці сфармуляваныя высновы з гэтай тэзы? Галоўная зь іх: звычны для Ўсходу комплекс сэрвільнасьці менавіта ў Расеі стаўся ўсемагутным. На Ўсходзе ён лагодзіўся менавіта ўсходнімі традыцыямі, заснаванымі на старажытнай цывілізацыі ды рэлігійных нормах. А тут іхнае мейсца заняла хрысьціянская традыцыя ў яе найбольш сэрвільнай форме (праваслаўе).

Дзе яшчэ нявольніцтва ў форме, блізкай да клясычнага рабства (прыгонных прадавалі, каралі, забівалі), захавалася да сярэдзіны XIX стагодзьдзя? Хіба што ў паўднёвых штатах ЗША (ізноў жа абмовімся, што рабамі там былі ўсё ж афрыканцы, чыя адметнасьць давала падставу для няроўнасьці). Хто заўсёды прывычна скідаў шапку перад валадаром? Хто палымяна ды лісьліва хваліў правадыра і рабіў гэта тым больш, чым больш жорстка ставіўся да яго валадар?

Вядома, згадваць пра гэта непрыемна. Але гэта праўда. Як праўда тое, што традыцыйнае расейскае грамадзтва й праваслаўная царква не змаглі выпрацаваць неабходных культурных і сацыяльных процівагаў самапраўству ўладаў.

Раб, хам, халуй

Я пачаў з таго, што комплекс сэрвілізму ўласьцівы ўсяму неэўрапейскаму сьвету. Аднак далёка ня ўсюды ён стаў сыстэмаю, якая запаланіла ўсё.

У канфуцыянскай цывілізацыі (а гэта, апроч Кітаю, яшчэ і Японія, Карэя, часткова Віетнам, ня кажучы ўжо пра краіны Паўднёва-Ўсходняй Азіі) процівагаю сэрвільнаму комплексу спакон вякоў было самое канфуцыянства – духоўная маральна-этычная й сацыяльна-палітычная дактрына. Яна патрабавала захаваньня рытуалу й цырыманіялу ў дачыненьнях паміж старэйшымі й малодшымі ды гэтым закілзала самавольства й хамства, не дапушчала ненармаванага прыніжэньня ніжэйшых.

У інда-будыйскай цывілізацыі нормы прыгнёту ніжэйшых (асабліва людзей зь нізкіх кастаў або пазакаставых у Індыі) былі больш жорсткія, аднак і тут яны абмяжоўвалі самаўладзтва, бо выразна замацоўвалі магчымае. Гэтак жа, хоць і ў меншай ступені, было ў ісламскіх краінах, дзе часьцей адчувалася самавольства ўладароў. Дый яно мела процівагу – моцнае кланавае адзінства аж да родавае помсты.

Карэспандэнт у гутарцы з пэўным лідарам нацыянальнага руху Паўночнага Каўказу згадаў пра тое, як зьняважліва сьпікер расейскага парляманту абыходзіцца часам з дэпутатамі, як непачціва гаворыць пра палітыкаў і міністраў. На гэта журналісту быў адказ, што такое на Паўночным Каўказе (адкуль родам сьпікер) немагчыма, бо ніхто не стрываў бы гэтага...

Гэты прыклад дапамагае зразумець, пра што ідзе гаворка ў артыкуле. Некаторыя ўсходнія цывілізацыі, іх сацыяльна-палітычная культура выпрацавалі пэўную процівагу самавольству ўладароў. У рамках расейскае палітычнае культуры, як высьвятляецца, гэтага няма. Толькі ў нас можна прыніжаць людзей бяз страху адплаты, для гэтага дастаткова быць вышэй за іх (паводле клясычнае формулы: "я начальнік – ты дурань"). Ці варта дзівіцца, што сэрвільнасьць, уласьцівая ўсяму Усходу, менавіта ў нас, у Расеі, набыла найбольш агідныя формы, абярнулася жорсткаю сыстэмаю? Гісторыкам, сацыёлягам, антраполягам, якія вывучаюць грамадзтва, добра вядома, што рабства – гэта перш за ўсё сацыяпсыхалягічная зьява. Раб, які прывык быць рабом, лёгка становіцца халуём і хамам, бо менавіта гэта ўласьціва псыхалёгіі раба. Раб, нават вызвалены з рабскага стану, часьцей за ўсё не ўяўляе грамадзтва ўладкаваным інакш, чым падзеленым на рабоў і ўладароў.

Прыкладам таму – грамадзтва рабоў-зінджаў, якія перамаглі ў паўстаньні ды стварылі дзяржаву, дзе ўладарамі сталі яны, а рабамі – ўсе астатнія. Да таго ж раб становіцца больш жорсткім уладаром, думае й дзейнічае адпаведна рабскай псыхалёгіі. Інакш кажучы, раб паводзіць сябе з кожным, хто апынецца пад ягонай уладай, па-хамску. Ды варта трохі зьмяніцца сытуацыі, як хам становіцца халуём.

Вось гэты комплекс сэрвільнасьці, не злагоджаны культурнымі ды рэлігійнымі нормамі й традыцыямі, у найбольш, так бы мовіць, чыстым выглядзе – гэта і ёсьць нашая традыцыйная расейская адметнасьць. Тая самая, якую так нялёгка зразумець. Тая, якая стала нашым лёсам.

Пахан, "дзед", сакратар парткама

Сыстэма магутная тым, што падмінае пад сябе ўсё. У жыцьці проста не застаецца месца, дзе б яна не дыктавала свае законы.

У Расеі ня ўсе і тым болей не заўсёды былі рабамі. Наадварот, гісторыя краіны ведае шмат непакорных, што змагаліся за волю.

Падзел на рабоў і не-рабоў стаў умоваю выжываньня за дыктатурай бальшавікоў. Руб паміж сваімі і чужымі, дзе чужых (ці хоць бы абвінавачаных у тым, што яны недастаткова свае) чакала пагібель, – вось страшны істотны сэнс дэклараванай імі клясавае барацьбы. Зьнішчаліся тыя, хто духоўна быў вольны, хто не хацеў, ня мог быць рабом. Заставаліся тыя, хто гатовы быў скарыцца. І нават калі сярод тых, што засталіся, захавалася пэўная частка лепшых, дык гэтая частка з часам (а лічылі пакаленьнямі) калі й не дэградавала, дык надоўга звыклася з сваім рабскім станам. Не-рабоў у Расеі заставалася ўсё менш, хоць і далёка ня ўсе гэта ўсьведамлялі, як не ўсьведамляюць і сёньня.

Структура створанага бальшавікамі грамадзтва заснаваная на страху, пакоры й гатоўнасьці падпарадкоўвацца. Тыя, хто адмаўляўся, зьнішчаліся ці гінулі. Тоесныя законам крымінальнага сьвету жорсткія нормы савецкай улады выхавалі ва ўсіх нас страх перад "беспределом" – няважна, адкуль і з чыйго боку. Пахан у турме, сакратар у партkаме, "дзед" у жаўнерскіх кашарах – хіба гэта не аднаго ладу зьявы, сутнасьць якіх зводзіцца да бязьмежнага прыніжэньня ўсіх, хто стаіць ніжэй маючага ўладу, якая б абмежаваная гэтая ўлада ні была? Супрацьстаяць і ацалець (ужо не кажу перамагчы – такога быць не магло) – сыстэма гэтага ня зносіла. Толькі ў апошнія два дзесяцігодзьдзі, калі нашае грамадзтва было ўжо ў стане каляпсу (заняпаду), зьявіліся дысыдэнты, пра якіх даведаўся сьвет. Перад тым лёс усіх іншадумцаў быў незайздросны.

У Расеі не-рабам здаўна даводзілася блага. Іх сьцігалі, а нават зьнішчалі. Разам зь імі гінуў і генафонд. І да свайго лягічнага завяршэньня працэс прыйшоў у гады бальшавіцкага тэрору, калі непакорныя зьнішчаліся сьвядома, пад лёзунгам клясавай барацьбы.

Даказчыкі і каты

Сэрвілізм паводле свае прыроды агрэсыўны, і гэта лёгка зразумець. Рабам уласьціва бунтаваць. Больш таго, на гэтым заснаваная ці ня ўся мудрасьць гістарычнага матэрыялізму, што заклікае да бунту або, паводле яго тэрміналёгіі, да клясавага бар'еру, да рэвалюцыйных барыкадаў. Бунт жа рабоў заўсёды страшны, але асабліва ў нас, пра што, уласна, пісаў Пушкін, які вывучаў пугачоўшчыну.

Чаму бунт рабоў бессэнсоўны і пры посьпеху яго, як гэта было ў выпадку зь зінджамі, і пры паразе? Ды таму, што ў вастраканфліктнай сытуацыі зьнікаюць рэшткі злагаджальнага ўзьдзеяньня на сэрвілізм рэлігіі ды культуры. На першы плян выступае агрэсіўнасьць. Агрэсіўнасьць тым больш страшная, чым даўжэй народ быў у палоне сэрвілізму, чым больш ён ад сэрвілізму нацярпеўся.

Сэрвілізм стала спараджае, падтрымлівае канфлікт, заўсёды дзеліць мір на сваіх, падобных да сябе, і на ўсіх астатніх, чужых, хай хоць чым-небудзь да цябе не падобных (гэта значыць не-рабоў).

Някрасаў неяк напісаў: "Люди холопского звания сущие псы иногда; чем тяжелей наказания, тем им милей господа!" І тыя, хто апантана хваліў Сталіна раней, і тыя, на каго не падзейнічала выкрыцьцё ў апошнім дзесяцігодзьдзі яго злачынстваў, і тыя, хто сёньня ўзьнімае на мітынгах ягоныя выявы, – усе яны ахвяры сэрвілізму.

Менавіта людзі гэтага тыпу ў гады Вялікага Тэрору зь дзіўнай лёгкасьцю пераўтварыліся ў натоўп катаў, якія, равучы ад лютасьці, былі гатовыя разарваць усякага, хто адмаўляўся ім прыпадабняцца або меў няшчасьце быць штучна вылучаным з гэтае безьлічы на навуку астатнім. Колькі было ў тыя гады самахотных даказчыкаў! Колькі было рупатлівых катаў, чыя дагодлівасьць пабуджалася ня столькі страхам, але і захапленьнем беспакаранасьці, пачуцьцём спрычыненасьці да равучага мноства. Вось ён, агрэсіўны сэрвілізм у дзеяньні!

Сэрвілізм спарадзіў і непавагу чалавека да сабе падобнага, ды й да самога сябе.

Напачатку гэта было падкрэсьленаю непавагай вярхоў да нізоў, дваранаў да прыгонных сялянаў. Адмена прыгону пахіснула гэтую старую норму дачыненьняў, але ненадоўга. Кастрычніцкі пераварот і грамадзянская вайна зноў паклікалі да жыцьця пракуду (фэномэн) непавагі да чалавека, што гэтым разам адбілася і было абгрунтавана ідэямі клясавае нянавісьці, перш за ўсё нянавісьці ўчарашняга раба да яго сёньня скінутага гаспадара. Гэта і быў час агрэсіўнага сэрвілізму, панаваньня непавагі да чалавека як генэральнае нормы.

Пазбаўленыя ўласнасьці, у стане прыніжаных уладай, людзі канчаткова страцілі павагу да сябе і, натуральна, да сабе падобных. Павага была замененая страхам перад уладарамі, перад прымусам. І калі павага, а разам зь ёю і міласэрнасьць яшчэ ў некага захаваліся, дык афіцыйная палітыка камуністаў зводзілася да таго, каб гэтыя рэшткі выкарчаваць.

Адсутнасьць павагі да іншага на практыцы абяртаецца непавагаю да самога сябе.

Калі Бога няма

Сэрвілізм нябачна нішчыць маральныя стандарты грамадзтва, і гэта перш за ўсё тлумачыць, чаму Расея ўвайшла ў XX стагодзьдзе з такім дэфіцытам маральнасьці. Я схільны меркаваць нават, што каб не было яго, бальшавікі не адолелі б Расею. Перамога бальшавікоў канчаткова падарвала яе маральныя й духоўныя асновы. З асабліваю сілаю, як вядома, духоўна-маральны крызыс праявіўся пасьля развалу савецкай імпэрыі, калі сэрвільны комплекс з выклікам выйшаў на авансцэну.

Спрэчкі, лаянка, зьнявага ці ўзаемныя падазрэньні, зьдзекі й вымагальніцтва – амаральнасьць акаляе нас. І ўсіх робіць яе байцамі. Я б нават сказаў, ператварае ў актыўных яе змагароў, вымушаных забыць або прынамсі часта забываць, што такое гармонія, міласэрнасьць, узаемная павага, нармальны чалавечыя духоўныя й маральныя нормы. Няма сэнсу асобна згадваць пра пашырэньне крадзяжоў і наагул злачыннасьці ў нашыя дні. Усё гэта з аднаго ланцужка.

Калі Бога няма, дык усё дазволена, – Дастаеўскі геніяльна сфармуляваў вялікую заканамернасьць духоўна-маральнага быцьця.

Кулак у ролі дысыдэнта

У раба няма ўласнасьці. І, натуральна, няма павагі да ўласнасьці. Рабу зразумела, што той, хто мае ўласнасьць, – гэта чужы, вораг.

Размова ідзе не пра фэадальную ці дзяржаўную ўласнасьць у фэадальнай ці блізкай да яе мадыфікацыі. Дзяржава дае ўладару маёнтак – раб успрымае гэта як належнае. Калі дзяржава дае ўладару разам з маёнткам права распараджацца прыгоннымі душамі, дык гэта ў межах прывычнага сэрвільнага комплексу зразумела. Для пазбаўленага ўласнасьці люду маёнткі – гэта нават ня ўласнасьць у рынкавым сэнсе. Гэта ўлада – права распараджацца. І гэтую ўласнасьць, частку дзяржаўнай улады-ўласнасьці, нельга было не паважаць. Больш таго, яе трэба было амаль абагаўляць, не сумляваючыся ў боскім праве прыгоньніка. Іншая рэч – уласнасьць свайго брата, мужыка, уласнасьць у сапраўдным, рынкавым сэнсе

Заканчэньне на стар. 8

Бедная Расея, няшчасныя расіяне...

Заканчэньне са стар. 7

гэтага слова, дробная прыватная ўласнасьць, хай нават і падкантрольная ўладам.

Гэтую ўласнасьць ня толькі не паважалі, яе ненавідзелі. Дробны ўласьнік зь сялянаў, кулак – гэта міраед, той, хто супрацьстаўляе сябе міру – абшчыне, прывычнай сялянскай абшчыне зь яе рэгулярным перараэьмеркаваньнем зямлі. Кулак-міраед зьненавіджаны сваімі аднавяскоўцамі менавіта за тое, што ён не такі, як усе. Нібы з сваіх, а ня хоча быць аднолькавы з усімі. Комплекс сэрвілізму праяўляецца ў непавазе да той уласнасьці, якая ня ўладамі дадзеная, а гарбом зробленая.

Дакладна такой была непавага да ўласнасьці й багацьця зь першых дзён савецкай улады. Хіба што гэтая непавага і нават нянавісьць распаўсюдзіліся, у новых умовах краху старой улады і былых сыстэмаў вартасьці, таксама і на ўласнасьць усіх учора ўладу маючых. Лёзунгі бальшавікоў-ленінцаў трапілі на добра ўгноеную глебу.

Пасьля была калектывізацыя.

Чаму ўса крадуць?

Дзесяцігодзьдзі савецкай улады, што ішлі ўсьлед за калектывізацыяй, замацавалі гэтую непавагу да ўласнасьці й багацьця тых, хто ня меў легітымнага ў вачох нашага люду права быць багатым.

Прыніжаны народ, зь яго комплексам сэрвільнасьці, такога роду права прызнаваў толькі за тымі, хто меў уладу і прывілеі, іншая рэч – "ценевікі", што спрабавалі нажыцца з хібаў сацыялізму. Зь імі размова кароткая: гэта нечысьць, якая перашкаджае нам жыць. Уладары зь іхнымі прывілеямі жыць дапамагалі. Гандлёвая нечысьць перашкаджала. Такім быў прыняты і да гэтага часу шмат кім падзяляецца стэрэатып.

У нашай краіне крадуць часта, многа і шмат хто. Крадуць буйна і дробязна, прымітыўна і нават віртуозна. Красьці пачалі ня ўчора, гэта быў біч краіны нашай і ў мінуўшчыне. Але так, як гэта робіцца сёньня, ніколі і нідзе яшчэ не было.

Калі ж запытацца, чаму нашыя маральна-праўныя нормы сталіся слабым лекам, дык зноў вернемся да таго, з чаго пачыналі: віною ўсяму сэрвільнасьць зь яе прыроджанай і мала чым абмежаванаю пагардаю да ўласнасьці, да чалавека, да нормаў маралі наагул. Я ўжо не кажу пра агрэсіўнасьць, часам нематываваную, нічым не вытлумачальную.

Вялікая зона

Дык што ж рабіць? Сьмешна скардзіцца на тое, што ў краіне крадуць, што ці мала дзяўчат сёньня лёгка прадаюцца ды імкнуцца прадаць сябе даражэй. Наіўна гараваць з-за непавагі да чалавека, росквіту грабежнікаў і махляроў, у тым ліку і рэспэктабэльных вымагальнікаў. Прадажнасьць і злачыннасьць натуральныя там, дзе страчаны асновы. Нашыя асновы былі лёгка падарваныя менавіта таму, што яны былі слабымі.

З шматлікіх злучаных паміж сабою прычынаў і фактараў наша краіна апынулася нібы па-за агульначалавечаю нормай. Тое, што яна зь сябе сёньня ўяўляе, бліжэй да нормаў злачыннага сьвету або турмы. Зазначу, што яшчэ ў часы бадзяньня Салжаніцына па Гулагу разумныя ды назіральныя людзі, якія сядзелі ў лягерох, слушна лічылі грамадзтва за межамі зоны пэўнага роду Вялікаю Зонаю, шмат у чым падобнаю да лягернае. Вынікае – наша галоўная задача сёньня – перастаць быць Вялікаю Зонаю. Зьвярнуцца да агульначалавечых, маральна-духоўных нормаў. Стаць нармальнымі людзьмі.

Плаўленыя сыркі за адзінаццаць капеек і .... аборы да лапцяў

Мы яшчэ памятаем палымяныя словы "самага чалавечнага чалавека", што такое камунізм. Ёсьць у нас і савецкая ўлада, і электрыфікацыя поўная. З гэтага вынікае, што мы жывем пры камунізьме. Ці можа ён у нас ужо быў, гэты самы камунізм? Паводле словаў аднаго камсамольска-трохкампартыйнага дзеяча, былі ж у нашых крамах плаўленыя сыркі за адзінаццаць капеек, цяпер – няма. Можа яны, сыркі, зьніклі ад абразы, што самі камуністы забаранілі дзейнасьць КПСС–КПБ на Беларусі? Го, плаўленыя сыркі за адзінаццаць капеек, вяртайцеся, КПБ на Беларусі зьявілася!

На каго ж разьлічана гэтая "сырковая" прапаганда?

Пра "полную электрификацыю" памятаеце? Здаецца, тут "вялікі правадыр" меў на ўвазе "полную дебилизацию". І тады ўсё становіцца на месца. Зноў на Беларусі ва ўсю моц загрукаталі камуністычныя барабаны, зноў уздымюцца крывавыя сьцягі і вядзецца прапаганда нянавісьці да дэмакратыі і свабоды, да нармальнага, чалавечага жыцьця. Ці ж былі ў нас дэмакратыя і свабода? Тыя кволыя парасткі, што ледзь-ледзь прабіліся, хочуць стаптаць бальшавікі-ленінцы. Уся ўлада ў іхных руках была і ёсьць: амаль 85% Вярхоўнага Савету і 100% Савету Міністраў – намэнклятурныя дзеячы КПБ–КПСС. І менавіта яны павінны адказаць за нашае жахлівае жыцьцё. Трэба заўважыць, што ўсё гэта рабілася і робіцца ад нашага імя, з нашае маўклівае згоды. Наш Вярхоўны Савет пасьля забароны рэфэрэндуму, вядома ж, ад нашага імя, вырашыў на апошняй сэсіі самае важнае пытаньне: рэанімаваў КПБ. Важней за рэанімацыю мерцьвякоў і пытаньняў няма, вось так. Няхай лепш здань камунізму блукае на Беларусі. Але ж мёртвае ня можа стаць жывым. Ад мерцьвяка йдзе толькі смурод і трупная атрута. Вось гэтая атрута і ёсьць самая небясьпечная для ўсяго жывога. Мала нашым ленінцам дзясяткаў і дзясяткаў мільёнаў забітых, закатаваных і зьнявечаных у сталінскіх лягерох, мала Чарнобылю, атручанага паветра й вады, вынішчаных лясоў і зьнявечаных бальшавіцкаю прапагандаю чалавечых душаў. А Беларусь для іх вельмі добры палігон для выпрабаваньня сваіх вар'яцкіх ідэяў, бо мы ўжо добра зьнявечаныя гістарычным бяспамяцтвам. Таму і вядзецца ваяўнічая ды нахабная прапаганда супраць нашае дзяржаўнасьці, незалежнасьці, нашае роднае мовы, сьцяга і сымбаляў, лютая нянавісьць да ўсяго беларускага, акрамя сала ды каўбасы.

Нахабна сьцьвярджаюць, што ня было ў нас свае гісторыі, ня было дзяржавы і наагул ня было аніякіх беларусаў. Выступаюць адзіным фронтам і камуністы, і СС (Славянский собор), і расейскія шавіністы, і "Эрыданы", і расейскія акадэмікі-"беларусы". Да іх можна далучыць і дэпутацкую групу са зьдзекліваю назваю "Беларусь" у Вярхоўным Савеце. І ўсе яны зь вялікай надзеяй глядзяць на Ўсход. А ці не ўздымаецца адтуль, з Усходу, сонейка расейскага нацыянал-камунізму? Гэткі монстар з камуністаў, манархістаў і шавіністаў. Але тое сонейка будзе вельмі крывавым для ўсіх, для ўсяго жывога. Маю надзею, што гэта не адбудзецца.

Дзьвесьце гадоў таму нас, беларусаў, абулі ў расейскія лапці. Так і ходзім. І пазбыцца ня можам, бо трымаюць аборы. Акрамя вышэй згаданых "абораў", ёсьць і іншыя. Іншыя – гэта тыя зьнявечаныя душой беларусы, якія не ўяўляюць сабе іншага жыцьця, як пад апекай "старэйшага брата", ды яшчэ з бальшавіцкім абліччам.

Менавіта іх, а праз іх і ўсіх нас, "славянская" прапаганда залічыла ў "русскоязычные", "русскоязычное население". Амаль штодня ў расейскіх сродках масавай інфармацыі і паведамляецца пра парушэньні правоў чалавека ў дачыненьні да "русскоязычных" у краінах Балтыі, Закаўказьзя, Сярэдняй Азіі, Малдове. Заўважце, не канкрэтна расейцаў, беларусаў, украінцаў ці іншых, а "русскоязычных". Гэта ўжо нешта арыгінальнае.

Асабіста мяне вельмі трывожыць інфармацыя, у якой гаворыцца, што таджыкі са свае Радзімы, прарываючыся праз "неприступные рубежи", уцякаюць у Аўганістан, туды, дзе ідзе вайна.

"Забитость" беларусаў – гэта ўжо ў мінулым. Мы яшчэ былі і "тутэйшыя", а цяпер – ад замілаваньня сьлёзы з вачэй раўчуком – "талерантныя". Радуйцеся, беларусы! Абулі ў расейскія лапці – трывайце, надзелі бальшавіцкі хамут – трывайце і радуйцеся, бо бязь іх прападзеце. І палохаюць жахамі, якія на нас зваляцца, калі станем сваім розумам жыць. Памятаеце, як адзін двойчы герой фашызмам нас палохаў? Бедны, сам так запудзіўся, што ад страху ў Маскву зьбег на "кілбасную" пасаду. Так вось народны выбраньнік народ свой "абараняе".

Пра свабоду сродкаў інфармацыі на Беларусі і гаварыць няма чаго. Амаль што ўсе яны – урадавыя. Савет Міністраў стаў манапалістам і вырашае (за нашыя грошы), што нам можна чытаць, глядзець, слухаць. Кебіч: – "Наш дарагой Пётр Міронавіч", і тут жа загад: "Усім надрукаваць і зачытаць!" А не, дык мы вас....! Але ж "Народная газэта" не спалохалася. Таму і зьявіцца новы "наш дорогой..."!

Нам трэба жыць сваім розумам. Мы такі ж народ, як і ўсе іншыя. Маем і талент, і працавітасьць, і мудрасьць. Можам мы жыць ня горш за тых жа немцаў, амэрыканцаў, французаў, можам. Усё залежыць толькі ад нас саміх.

Міхась Каляда

Хто какім языком хаціт...

ПРОТОКОЛ

конференции трудового коллектива швейной фабрики "Комсомолка" от 3.03.93.

СЛУШАЛИ: О выборах делегатов на городскую конференцию ТБМ имени Скорины.

ПОСТАНОВИЛИ: Выбрать на конференцию следующих работников:

I. Герасименок Олимпиада Ивановна -воспитатель д/с IO
2. Амелькович Людмила Степановна -воспитатель д/с 29
3. Сенько Янина Ивановна - депутат горсовета

Председатель [подпись] В.А.Тавгень

ПРОТОКОЛ №7

конференции трудового коллектива ПТК"Аксамит" от 3.03.1993г.

СЛУШАЛИ: О выборах делегатов на горадскую конференцию ТБМ имя Скарины.

ПОСТАНОВИЛИ: Избрать делегатами от ПТК "Аксамит" на городскую конференцию ТБМ имя Скарины следующих работников:

Брисюк Раису Алексеевну
Гончар Виктора Иосифовича
Ельяшевич Галину Анатольевну

Председатель конференции [подпись] А.Н.Стасилевич

Секретарь конференции [подпись] Е.К.Козловская



Малюнак Кастуся Кіпеня

НАВІНЫ Беларускага Народнага Фронту "АДРАДЖЭНЬНЕ"
Заснавальнік Зянон Пазьняк

Індэкс 63895
Ліцэнзія №67

Адрас рэдакцыі: г.Менск, Рабкораўскі зав., 14. "Навіны БНФ"

У нумары скарыстаная выява Пагоні з тытульнага аркуша Статута Вялікага Княства Літоўскага 1588 г.

Падпісана да друку 16 сакавіка 1993 г.
Наклад 10 000 ас.
Надрукавана ў Магілеўскай абласной друкарні

Галоўны рэдактар Зьдзіслаў Сіцько